Калі ласка, не спазніцеся з перадаплатай за нумары другога паўгоддзя. Застанемся разам!

№№103–104
(2623–2624)

29 чэрвеня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

ПІКІРОЎКА

Аляксандр ЯРАШУК:

«Беларусь — другая краіна ва ўсім свеце, якую пазбавілі гандлёвых прэферэнцый...»

21 чэрвеня пачало дзейнічаць рашэнне Еўрасаюза аб спыненні гандлёвых прэферэнцый для Беларусі. Падлічана, што страты краіны штогод складуць 300—400 мільёнаў еўра.

Актывісты незалежных прафсаюзаў Беларусі склалі спіс чыноўнікаў, дзеянні якіх, на іх думку, і прывялі да такога рашэння Еўрасаюза. У спісе ўзгадваюцца прозвішчы старшыні ФПБ **Леаніда КОЗІКА**, міністра юстыцыі **Уладзіміра ГАЛАВАНАВА,** сённяшніх і былых кіраўнікоў шматлікіх беларускіх прадпрыемстваў.

Улады не засталіся ў даўгу. Яны прад'явілі народу іншых вінаватых. На гэты раз з ліку прадстаўнікоў незалежных прафсаюзаў.

На мінулым тыдні з вуснаў аналітыкаў Беларускага тэлебачання фактычна прагучаў заклік узбудзіць крымінальную справу супраць старшыні Беларускага Кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў **Аляксандра ЯРАШУКА**, экс-лідэра прафсаюза аўтамабіле- і сельгасмашынабудавання, аднаго з кіраўнікоў сённяшняга прафсаюза РЭП **Аляксандра БУХВОСТАВА** і лідэра Рэспубліканскага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці **Генадзя ФЕДЫНІЧА**, якія быццам бы сваімі намаганнямі дабіліся таго, што Еўрасаюз пазбавіў Беларусь ільгот пры экспарце тавараў.

— Чарговыя страшылкі, спроба ажыццявіць на нас нейкі ціск, — так пракаменціраваў сюжэт на Беларускім тэлебачанні **Аляксандр Ярашук.** — Нічога арыгінальнага беларуская прапаганда не прыдумала, выплюхнула чарговую порцыю прымітывізму, разлічаную на неадукаванага абывацеля. Трэба сябе не паважаць, каб уступаць з імі ў нейкія спрэчкі.

Я думаю, што ў Беларусі толькі адзінкі больш-менш дасведчана ведаюць праблему скасавання гандлёвых прэферэнцый. Ніхто ж нічога па сутнасці не тлумачыць, не дае слова незалежным прафсаюзам, толькі вешаюць на нас усіх сабак. І атрымліваецца, як у савецкія часы з Барысам Пастэрнакам, — не чытаў, але асуджаю. Так і тут. Не ведаю, у чым справа, але па тэлебачанні сказалі, хто вінаваты ў тым, што краіна будзе губляць мільёны еўра штогод... На самай справе ні я, ні Бухвостаў, ні Фядыніч не прапаноўвалі Еўрасаюзу скасаваць ільготы для Беларусі. Тым больш зразумела, што ні адна ўлада, што б ні здарылася, ад голаду пухнуць не будзе. Усё ляжа на плечы народа. І не мы вінаватыя ў тым, што здарылася. Незалежныя прафсаюзы беларускі ўрад паставіў ў становішча ахвяры, а сам дзейнічаў як тэрарыст. Але пагражаў ён не толькі нам, беларуская ўлада фактычна кінула выклік усёй міжнароднай супольнасці.

— Дык хто ж усё-такі залез у кішэню беларускага народа?

— Гэта вельмі сур'ёзнае пытанне. Гандлёвыя прэферэнцыі — гэта не эканамічныя санкцыі. Гандлёвыя прэферэнцыі былі ўведзены Еўрапейскай камісіяй у 1971 годзе па патрабаванні міжнароднага прафсаюзнага руху. Гэтая сістэма ўяўляе сабой паніжэнне мытных пошлін для экспартуемых тавараў. Увядзенне гэтай сістэмы было своеасаблівым стымулам для краін, якія сталі на шлях развіцця, выконваюць свае абавязкі ў сферы правоў прафсаюзаў. За ўвесь гэты час толькі аднойчы ў Еўрапейскага Саюза знаходзілася падстава скасаваць гандлёвыя льготы. Такое рашэнне было прынята ў 1999 годзе ў адносінах да Бірмы, дзе пануе рэжым ваеннай хунты і дзе выкарыстоўваецца прымусовая праца, дзе людзей ланцугамі прывязваюць да працоўнага месца, дзе вымушаюць працаваць дзяцей.

Беларусь, уявіце сабе, стала другой такой краінай на нашай планеце! У нас, праўда, не дайшло да прымусовых прац, аднак з'явіліся свае ланцугі. У першую чаргу, у выглядзе працоўных кантрактаў. Прэферэнцыі для Беларусі скасоўвалі за канкрэтныя парушэнні правоў прафсаюзаў, якія доўжацца ў краіне з 1995 года, з моманту жорсткага ўдушэння страйку на Мінскім метрапалітэне, пасля якога былі незаконна звольненыя машыністы метро. МАП разглядаў гэтую справу, прызнаў страйк законным і прапанаваў беларускаму ўраду аднавіць машыністаў на працы, але гэтага не здарылася.

З пачатку 2000-х гадоў парушэнні правоў прафсаюзаў у Беларусі пачалі насіць сістэматычны, цынічны характар. Гэта прывяло да таго, што МАП рэагуючы на скаргі незалежных прафсаюзаў, пяць разоў уключаў Беларусь у спецпараграф Міжнароднай арганізацыі працы і адзін раз, у 2004 годзе, прызначалася камісія па расследаванні парушэння правоў прафсаюзаў у Беларусі. Зазначу, што такая камісія за ўсю амаль дзевяностагадовую гісторыю МАП прызначалася толькі чатыры разы. Уяўляеце, якой вастрыні дасягнула пытанне?! Акрамя таго, у 2003 годзе Міжнародная канфедэрацыя свабодных прафсаюзаў, Еўрапейская канфедэрацыя працы і Сусветная канфедэрацыя працы — тры самыя буйныя прафсаюзныя арганізацыі свету — звярнуліся ў Еўрапейскую камісію з прапановай скасаваць гандлёвыя прэферэнцыі для Беларусі. Усё за тое ж — за парушэнне правоў працоўных.

— Атрымліваецца, што ў беларускай улады было шмат часу, каб выправіць сітуацыю?

— Напрыканцы 2004 года Еўракамісія накіравала беларускаму ўраду для выканання 12 рэкамендацый. Але ў нашай краіне ніхто нават пальцам не паварушыў, становішча ў справе з прафсаюзамі толькі пагаршалася, і ўсё гэта прывяло да таго, што 20 снежня 2006 года Савет міністраў Еўрапейскага Саюза прыняў рашэнне аб скасаванні прэферэнцый. Толькі пасля гэтага з беларускага боку былі зроблены некаторыя крокі па выкананні рэкамендацый Еўрасаюза.

— Напрыклад?

— Беларускі Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў аднавілі ў якасці члена Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, скасавалі Рэспубліканскую камісію па рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў і аднавілі ў працы аднаго актывіста, незаконна звольненага за прафсаюзную дзейнасць. І гэта ўсё... Самыя прынцыповыя рэкамендацыі — адмена дазвольнага прынцыпу стварэння прафсаюзаў, які ўвёў у 1999 годзе сваім дэкрэтам А.Лукашэнка, і іншыя — не былі выкананы.

— На Ваш погляд, зараз можна штосьці выправіць? У сваёй заяве Вы пісалі, што і сёння гатовы да канструктыўнага дыялогу з беларускім урадам?

— Я лічу, што для беларускай улады існуе адзіны варыянт паводзін — выканаць усе рэкамендацыі Еўрасаюза. Але ж яна, хутчэй за ўсё, абярэ іншыя варыянты.

Дарэчы, я лічу, што лічба ў 300—400 мільёнаў еўра хутчэй за ўсё перабольшаная. Зроблена гэта для таго, каб спісаць на Еўропу цяжкае становішча, у якое трапіла Беларусь пасля нафтагазавага канфлікту з Расіяй. Зразумела, што кошты на энерганосьбіты будуць і далей павышацца. Таму для беларускай улады вельмі зручна знайсці і прад'явіць народу ўнутранага ворага ў выглядзе незалежнага прафсаюза і знешняга — у выглядзе Еўрасаюза...

Так, пазбаўленне краіны гандлёвых прэферэнцый — гэта нечуваны прэцэдэнт. Трынаццаць гадоў беларускай уладзе ўсё сыходзіла з рук, а зараз не сышло. І няма ўпэўненасці, што гэта апошняя санкцыя...

А ворагаў народа няхай розныя зімоўскія, пракопавы і іншыя шукаюць не ў незалежных прафсаюзах, а сярод тых, хто баіцца іх, як чорт ладана, хто хацеў бы, каб у людзей было толькі адно права — з ранку да вечара гнуць спіну і нічога не патрабаваць.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

СТИХИЯ

Европа: небывалые наводнения и жара

В Великобритании растет число жертв проливных дождей, которые обрушились на многие районы страны. В центральных графствах на севере Англии и юге Шотландии за сутки выпала двухмесячная норма осадков. Многие населенные пункты оказались затопленными.

Самая тяжелая ситуация в Южном Йоркшире, в районе Шеффилда. Спасательные службы сообщают, что просьбы о помощи поступали каждые 30 секунд. Больше всего были востребованы вертолеты — их экипажи работали на пределе возможностей.

Материальный ущерб огромен. Дороги затоплены, повреждены участки железнодорожного полотна, полностью или частично разрушены десятки домов, многие из которых имеют историческое значение.

В Турции отмечена самая жаркая за последние годы погода, есть жертвы. Так, в курортном городке Фетхие на побережье Эгейского моря, где столбик термометра зафиксировал температуру 51 градус по Цельсию, от сердечного приступа скончался 47-летний местный житель.

В курортной Анталье температура в обеденное время достигала 47—50 градусов.

Велика вероятность, что нынешний июнь стал самым жарким в Греции за последние 90 лет. Температура достигла 43 градусов по Цельсию.

Чрезвычайная ситуация сложилась из-за жары в ряде городов в центре и на юге Италии. Была остановлена работа ряда предприятий, на Сицилии возникли пожары, парализующие транспортное сообщение.

Столбик термометра преодолел 40-градусную отметку в городах Бари, Пескара, Кампобассо, а также в Катании и Палермо. Температуры, близкие к рекордному максимуму, зафиксированы также в Риме.

ТАК И СКАЗАЛ

Александр ЛУКАШЕНКО:
«Я делаю один вывод, что правительство за счет бюджета пытается скрыть свою несостоятельность и плохую работу».

(26 июня на совещании по вопросам оказания господдержки организациям реального сектора экономики.)

НУ І НУ!

«Суперсенсацыйны» сюжэт

Днямі па БТ, у прыватнасці, было аб'яўлена аб затрыманні на беларуска-польскай мяжы "чатырох актывістаў радыкальнай беларускай апазіцыі" — прэс-сакратара незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт", "фронтаўца" з Гродна і яшчэ двух актывістаў Партыі БНФ. Далей з жахам расказвалася, што ў затрыманых былі два ноутбукі "з электроннымі дапаможнікамі па тэрарызме", а ў схаваных файлах, маўляў, знайшлі электронную энцыклапедыю вытворчасці мін і выбуховых прастасаванняў, "Настольную кнігу тэрарыста" і "100 спосабаў самазабойства".

Што і казаць — сур'ёзнае абвінавачванне. Праўда, акурат у дзень, калі сюжэт з'явіўся ў тэлеэфіры, "затрыманы" прэс-сакратар незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" Барыс Гарэцкі спакойна сеў у аэрапорце "Мінск-2" у самалёт і вылецеў у Страсбург на пасяджэнне Савета Еўропы.

"Размова ў тэлесюжэце ішла пра Барыса Гарэцкага, Яўгена Скрабутана, Зміцера Мальчыка і Аляксея Трубнікава, — распавядае маладзёжны актывіст Зміцер Хведарук. — Яшчэ зімой, у снежні мінулага года, усіх чацвярых і на самай справе затрымалі на мяжы і без усялякіх тлумачэнняў канфіскавалі ноутбук (праўда, адзін, а не два, як казалі па тэлебачанні). Хлопцы ўвесь час пісалі скаргі, каб ім вярнулі камп'ютэр, аднак у адказ чулі: тэхніка, маўляў, знаходзіцца на нейкім даследаванні. Паўгода прайшло! За гэты час у камп'ютэр маглі напхаць што заўгодна. І зараз могуць казаць што заўгодна. Адным словам, гэта яшчэ больш фарс, чым тэлесюжэт двухтыднёвай даўнасці пра Артура Фінькевіча, які, быццам бы, вядзе сябе непрыстойна ў калоніі і ўжывае там алкагольныя напоі. Аднак не думаю, што ўсё гэта робіцца проста так. Нешта ўлады рыхтуюць для нас..."

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Лідэрам дэмакратычных партый, грамадскіх рухаў, суполак

Будзем разам!

Шаноўныя партнёры па святой справе!

Вы добра ведаеце: толькі прарыў інфармацыйнай блакады зможа абудзіць грамадства, падштурхнуць яго да актыўных дзеянняў на карысць дэмакратычных пераменаў.

Цяжка ўявіць члена вашай партыі, грамадскага руху, суполкі без "Народнай волі"! Таму вялікая просьба: парэкамендуйце ім тэрмінова, да 1 ліпеня, зрабіць перадаплату (умовы — на 8 стар.) за нумары другога паўгоддзя.

Разумеем, многія актывісты не могуць звязаць канцы з канцамі, лічаць кожную капейку. І тут добра было б, калі б на дапамогу прыйшло кіраўніцтва партый, рухаў, суполак. У любым выпадку нельга дапусціць, каб сябры па святой справе засталіся без аб'ектыўнай інфармацыі, без свабоднага слова.

«Народная воля» — з Вамі!
Вы — з «Народнай воляй»!

ОФИЦИАЛЬНО

Петр МИКЛАШЕВИЧ:

«В интересах следствия их фамилии я оглашать не буду»

Накануне 85-летия Прокуратуры Беларуси руководитель ведомства Петр Миклашевич встретился с журналистами

Во время пресс-конференции генпрокурору пришлось ответить на вопросы, касающиеся громких задержаний, которые имели место в стране в последние месяц-полтора. Примечательно, что в своем вступительном слове Петр Миклашевич ни словом не обмолвился, например, об уголовном деле в отношении руководителя "Белнефтехима" Александра Боровского или о задержании высокопоставленных сотрудников Комитета госбезопасности. Эту информацию журналистам приходилось буквально вытаскивать клещами, то и дело задавая уточняющие вопросы. И кое-что генпрокурор все-таки сказал. Во всяком случае, он стал первым официальным лицом, которое подтвердило факт задержания полковников КГБ.

Чекисты за решеткой

— Действительно, 31 мая прокуратурой Республики Беларусь было возбуждено уголовное дело по ст.430 ч.3 — получение взятки в крупном размере лицами, занимающими ответственное положение, — *заявил Петр Миклашевич.* — Привлечены три полковника, два — КГБ, один — МВД. Один их них действующий полковник КГБ. В настоящее время они арестованы, расследование проводит Генеральная прокуратура Республики Беларусь. В целях сохранения тайны следствия на данном этапе другой информации я не даю.

Руководитель "Белнефтехима" обворовал страну не на один миллион долларов?

29 мая сотрудниками КГБ был задержан председатель Государственного концерна "Белнефтехим" Александр Боровский. Генеральный прокурор страны Петр Миклашевич был первым, кто сообщил эту сенсационную новость журналистам. Это случилось накануне коллегии Генпрокуратуры. Тогда же Миклашевич пообещал, что на очередной пресс-конференции он расскажет о подробностях этого задержания. Однако многословным чиновник не был и на этот раз.

— Генеральной прокуратурой в отношении Боровского было возбуждено уголовное дело по ч.4 ст.210 УК, — *проинформировал Петр Миклашевич.* — Это хищение путем злоупотребления служебными полномочиями в особо крупном размере. 6 июня 2007 года ему предъявлено обвинение по данному составу преступления. Также в отношении Боровского 8 июня Генеральной прокуратурой возбуждено уголовное дело по ч.3 ст.424 УК "злоупотребление служебными полномочиями, причинившими крупный ущерб". Также в отношении него расследуется уголовное дело по ч.2 ст. 375 УК — по факту умышленного разглашения сведений, составляющих служебную тайну. Это не связано с выступлением Боровского на "Нафтане" (напомним, что сенсационная запись откровений руководителя концерна, содержавшая критику действий правительства, появилась в сети Интернет), это связано с определенными хищениями при проведении определенных финансовых операций с нефтепродуктами.

По этим трем составам уголовных преступлений в отношении Боровского ведется расследование, которое проводит Комитет государственной безопасности. Соответствующий процессуальный надзор осуществляют органы прокуратуры.

Также предъявлено обвинение другим лицам, причастным к совершению указанных преступлений. В интересах следствия их фамилии я оглашать не буду. Задержано в пределах 5—6 человек. Здесь есть и руководители концерна "Белнефтехим", и руководители некоторых коммерческих структур нашей страны. Когда дело будет идти к завершению, тогда их фамилии мы доведем до вашего сведения.

Схему преступления тоже раскрывать не будем. Вы знаете, чем занимается концерн "Белнефтехим". Это поставка, закупка и реализация нефти и нефтепродуктов... Хищения связаны с этими операциями. Ущерб на данном этапе исчисляется не одним миллионом долларов. Окончательная сумма ущерба будет установлена при окончании расследования данного дела.

Под особым контролем...

— Генпрокуратурой продолжается расследование по фактам незаконного ввоза на территорию Республики Беларусь крупных партий различных товаров по поддельным товаросопроводительным документам через таможню "Западный Буг", а также через Гродненскую региональную таможню. В июле этого года мы завершаем расследование первой части уголовного дела в отношении 22 лиц. Из них 9 — сотрудники таможенных органов. Дело будет направлено в суд. Их преступными действиями причинен ущерб на сумму свыше 24 миллиардов рублей. Через три месяца будет завершено расследование второй части этого уголовного дела. К ответственности будет привлечено около 50 обвиняемых, в их числе 25 сотрудников таможенных органов. Предварительно установлен ущерб, причиненный их действиями. Он составляет около 90 миллиардов рублей.

Генпрокурор не скрывал, что на особом контроле — преступления, совершенные высшими чиновниками. И привел еще один пример по делу, которое уже было рассмотрено в суде и по которому уже вынесен приговор:

— 15 мая текущего года Военная коллегия Верховного суда постановила оставить в силе приговор в отношении Талая — бывшего начальника службы вооружения Минобороны, Муленко —- начальника службы полигона Минобороны, Пупко — директора Департамента антимонопольной и ценовой политики Минэкономики и ряда других лиц. В результате их преступных действий, связанных с реализацией автомобильной техники по заниженным ценам, был причинен ущерб государству на сумму свыше миллиарда рублей. В том числе осужденный Пупко получил взятку за действия, которые способствовали такому хищению, в сумме 200 тысяч долларов США. Все они осуждены на срок от 6 до 12 лет лишения свободы.

Заместитель Василия Старовойтова еще в Москве

На прошлой неделе информационные агентства сообщили, что 15 июня в Москве был задержан бывший заместитель руководителя ОАО "Рассвет", друг бывшего управделами белорусского президента Ивана Титенкова Николай Гецман. МВД Беларуси разыскивает Гецмана с 1999 года по обвинению в крупных хозяйственных преступлениях.

— Николая Гецмана задержали в Москве, — *подтвердил информацию генпрокурор.* — Сейчас решается вопрос о его экстрадиции. В ряде случаев мы сталкиваемся с определенными уловками, к которым прибегают лица, находящиеся в розыске на территории других государств. В частности, те, кто находится на территории Российской Федерации, пытаются начать процедуру принятия гражданства России. Соответственно, тогда процедура передачи обвиняемого затягивается. В отношении Гецмана уже начата процедура экстрадиции. Генпрокуратура Беларуси готовит соответствующие документы, и мы рассчитываем, что в ближайшее время он будет экстрадирован в Беларусь.

Стоит отметить, что в основном преступники скрываются на территории Российской Федерации. Это обусловлено условиями свободного выезда в Россию. В среднем вопросы, связанные с экстрадицией, приходится решать ежегодно в отношении около тысячи лиц.

Зарплата у генпрокурора не увеличилась

Как известно, с 1 июня Республиканская прокуратура Беларуси была переименована в Генеральную прокуратуру Беларуси.

— труктурное изменение было обусловлено тем, что только в нашей республике центральный орган не назывался Генеральной прокуратурой, — *рассказал журналистам Петр Миклашевич.* — Скажу откровенно, мне было даже неудобно. Генпрокурор есть, а Генеральной прокуратуры — нет. Это несоответствие сегодня устранено.

Изменений в материальном плане и обеспечении сотрудников это не повлекло, поскольку функции и задачи остались прежними... Численность аппарата Генпрокуратуры осталась также прежней.

Какую конкретно зарплату получает генеральный прокурор Беларуси, Петр Миклашевич не поведал. И не признался, получат ли к празднику — к 85-летию органов прокуратуры — премии прокуроры и следователи страны. Их, к слову, в Беларуси 1940, из них — 434 женщины.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

АСОБА

Адрыян СЕВЯРЫН:

«Я заўсёды правяраю, пасля пераправяраю, а потым ізноў правяраю»

ААН скасавала пасаду адмысловага дакладчыка па Беларусі ў Савеце па правах чалавека ААН. Як вядома, гэтую пасаду займаў былы міністр знешнепалітычных сувязяў Румыніі Адрыян СЕВЯРЫН. Праваабаронцы наконт скасавання ягонага мандата адзінадушны: Севярын стаў закладнікам актыўнасці ў ААН краін, далёкіх ад дэмакратыі, якія фронтам сталі на абарону Беларусі. У першую чаргу гэта Беларусь і Кітай, якія абвінавацілі Севярына ў неаб'ектыўнасці. Але гэта не той чалавек, якому можна так проста закрыць рот.



Адрыян Севярын — чалавек надзвычай красамоўны, але, у адрозненне ад большасці сваіх калег, чуе суразмоўцу, яго адказы на пытанні кароткія і дакладныя. Ён робіць уражанне чалавека страснага ў пошуку праўды. І, што дзіўна, яго даклады па Беларусі пэўным чынам нават ядналі беларускія ўлады і апазіцыю — абодва бакі іх рашуча крытыкавалі. На думку палітыка, такая рэакцыя сведчыць на карысць аб'ектыўнасці яго высноў, што, дарэчы, шчыра яго цешыць.

— Спадар Севярын, Вы працавалі з Беларуссю з 1995 года. Не надакучыла?

— Калі сур'ёзна ставіцца да праблемы ажыццяўлення палітычных свабод і правоў чалавека, стаміцца немагчыма. Да таго ж я вельмі сімпатызую і спачуваю вашай краіне.

— Усё яшчэ ёсць падставы для спачування?

— Як мне падаецца, апошні год у любым выпадку не прынёс ніякіх рашучых змен. Толькі на працягу апошніх месяцаў Мінск прадэманстраваў нейкую гатоўнасць да пэўнага дыялогу і супрацоўніцтва з Еўропай: былі падоўжаны дамовы з некаторымі НДА на арэнду памяшканняў, каб тыя змаглі працаваць; выпусцілі некаторых асуджаных па палітычных матывах... Але, на жаль, усё гэта немагчыма назваць зменамі, проста ўлады сталі паводзіць сябе з меншым выклікам. Дык што ж гэта за змены?

— Як Вам падаецца, Вы разумееце беларусаў?

— Я б хутчэй сказаў, што спачуваю ім. Слова "разумець" тут не зусім падыходзіць, бо пад ім можна мець на ўвазе прымаць сітуацыю ў краіне з правамі чалавека. Многія беларусы наогул гэтай сітуацыяй не цікавяцца і не гатовы абараняць свае правы. Мне падаецца, што я дастаткова дасведчаны ў беларускай сітуацыі і разумею, што адбываецца. Мабыць, менавіта таму і не стаміўся працаваць над гэтым пытаннем і сыходзіць не збіраюся. Хаця прычын апусціць рукі хапае. Так, я вельмі доўга спадзяваўся на супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі ў пытанні паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека. Нуль зменаў!

Але ёсць спадзяванні, што міжнародная супольнасць нарэшце аб'яднае намаганні і мабілізуе магчымасці для падтрымкі дэмакратычных змяненняў у краіне. Я веру, што краіны — суседкі Беларусі выступяць на карысць гэтай высакароднай мэты адзіным фронтам. Яшчэ хочацца спадзявацца на тое, што дэмакратычныя сілы Беларусі будуць працаваць разам і эфектыўна. Хаця з часам лёгка прыйсці да адчаю, калі бачыш, што твае надзеі не маюць пад сабой асновы.

— Беларускія ўлады не выказвалі жадання супрацоўнічаць з Вамі, пасля прызначэння на пост адмысловага дакладчыка па Беларусі Вас наогул не пускалі ў нашу краіну. І ўсё ж для падрыхтоўкі сваіх дакладаў Вы выкарыстоўвалі інфармацыю і з афіцыйных крыніц, і ад апазіцыйных колаў. Але ж яна вельмі часта цалкам супярэчыць адна адной. Каму вы давяраеце?

— Я працаваў не толькі з афіцыйнай інфармацыяй і звесткамі, атрыманымі ад апазіцыі і грамадзянскай супольнасці, але і з такімі трэцімі крыніцамі, як, напрыклад, міжнародныя няўрадавыя арганізацыі. І акрамя таго, я заўсёды правяраю дадзеныя, пасля яшчэ раз правяраю і пераправяраю, імкнучыся аналізаваць іх у кантэксце. Згадзіцеся, што калі б сітуацыя ў краіне не выклікала нараканняў, беларускія ўлады лёгка пайшлі б на дыялог, тым самым давёўшы, што высновы майго даклада няслушныя. Меркаванні па апошнім дакладзе, які абмяркоўваўся ў Савеце ААН па правах чалавека 12 чэрвеня ў Жэневе, падзяліліся. Хтосьці яго падтрымаў, хтосьці не. Прамова пасланніка Беларусі ў ААН *(пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь у міжнародных арганізацыях у Жэневе Сяргей Алейнік. — Рэд.)* утрымлівала ў сабе агульную крытыку, ён нават не палічыў за неабходнае прывесці прыклады з майго даклада і растлумачыць, чаму штосьці там было няслушным. Адзінае, на што ён спасылаўся, гэта супярэчанне майго даклада дакладам іншых агенцый ААН, дзе, як я мяркую, не ставіцца пад сумнеў выкананне Беларуссю правоў чалавека. Беларускі пасол, аднак, не змог працытаваць і гэтыя даклады. Як пасля такога досведу я магу давяраць інфармацыі прадстаўніка афіцыйнага Мінска?

— І што зараз?

— Адмена пасады адмысловага дакладчыка па Беларусі негатыўным чынам адаб'ецца на перспектывах змен.

— Беларускія ўлады заяўляюць, што аддаюць перавагу паўнавартаснаму эканамічнаму і палітычнаму супрацоўніцтву з Еўропай, але не дапусцяць умяшальніцтва ва ўнутраныя справы краіны. Ці магчымы такі варыянт?

— Натуральна! Але з адзінай агаворкай: правы чалавека — гэта не пытанне для ўнутранага карыстання, яно не мае дзяржаўных межаў, таму што сваім клопатам мае не незалежнасць дзяржавы, а незалежнасць асобы. Натуральна, што кожная дзяржава мае права самастойна вырашаць свае ўнутраныя пытанні, але якраз правы чалавека да ўнутраных пытанняў не адносяцца.

Я спадзяюся, што беларусы зразумеюць неад'емнасць уласных правоў, навучацца іх абараняць, а ўлады ў сваю чаргу навучацца паважаць гэтыя правы. Змены ў Беларусі павінны выспець унутры краіны, а менавіта гэты працэс і займае шмат часу.

Марына РАХЛЕЙ.

Рэдакцыя выказвае ўдзячнасць "Офісу за дэмакратычную Беларусь" у Бруселі за дапамогу з арганізацыяй інтэрв'ю.

АСАБІСТАЯ СПРАВА

Адрыян СЕВЯРЫН *быў прызначаны адмысловым дакладчыкам ААН па пытанні становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі ў лістопадзе 2004 г. Беларускія ўлады адмовіліся з ім супрацоўнічаць. Севярын з'яўляецца дэпутатам Еўрапарламента. Нарадзіўся ў 1954 годзе ў Бухарэсце (Румынія). У розны час займаў пасады намесніка прэм'ер-міністра, міністра замежных спраў Румыніі, быў дэпутатам і дакладчыкам Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы, прэзідэнтам ПА АБСЕ, узначальваў падкамітэт ПА АБСЕ па Беларусі. Летам 1999 г. сустракаўся з Аляксандрам Лукашэнкам у якасці кіраўніка Рабочай групы ПА АБСЕ. У 2000—2001 гг. наведваў Беларусь у рамках візітаў парламенцкай "тройкі" — ЕС, Савета Еўропы і АБСЕ. Аўтар кніг па міжнародным гандлёвым праве, эканамічных і палітычных рэформах, міжнародных адносінах ды іншым. Лаўрэат міжнародных і нацыянальных прэмій. Валодае, акрамя румынскай, англійскай, іспанскай, італьянскай, рускай і французскай мовамі.*

ІНІЦЫЯТЫВА

Таксама адзначыліся...

Аргкамітэт па стварэнні Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі лічыць мэтазгодным пашырыць спіс чыноўнікаў, якім забаронены ўезд у краіны Еўрасаюза. Прапановы былі агучаны на нядаўняй сустрэчы ў Бруселі сустаршыняў БХД **Аляксея ШЭЙНА** і **Віталя РЫМАШЭЎСКАГА** з прадстаўнікамі Еўрасаюза, дыпламатычных місій еўрапейскіх краін, сябрамі праваабарончых арганізацый.

"Чорны спіс" прапаноўваецца пашырыць за кошт высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў, што непасрэдна заўважаны ў парушэнні правоў на свабоду сумлення, якія гарантаваны беларускай канстытуцыяй. На думку кіраўнікоў БХД, у спіс невыязных у ЕС мусяць быць унесены:

— упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце міністраў РБ **Леанід ГУЛЯКА,**

— ягоны намеснік **Уладзімір ЛАМЕКА,**

— начальнік аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Мінскага гарвыканкама **Ала РАБІЦАВА.**

Падставай для санкцый, на думку грамадскіх актывістаў, з'яўляецца тое, што менавіта гэтыя чыноўнікі падпісвалі адмовы ў рэгістрацыі рэлігійных абшчын у Мінску і па ўсёй Беларусі. Акрамя таго, на іх сумленні ліквідацыя пратэстанцкіх цэркваў і ціск на цэрквы шляхам разнастайных праверак.

Марына ВЯРШНЁВА.

НУ И НУ!

Бюрократы против туристов

Иностранный турист во время путешествия по Августовскому каналу через территорию Беларуси из Польши в Литву должен завизировать от 12 до 15 документов, установленных различными ведомствами нашей страны. Об этом сообщил директор туристического агентства "Немново тур" Сергей Коледа на семинаре "Законодательство о туризме: теория и практика", который проходил в Гродненской культурно-туристской зоне Постоянная комиссия Совета Республики Национального собрания по демографической безопасности и социальному развитию.

По его словам, фирмой "Немново тур" разработано три туристических маршрута для иностранных и отечественных туристов, маршруты которых проходят в зоне белорусской части Августовского канала. Сотрудники компании предприняли попытку организовать путешествие в полном соответствии с действующими нормами и правилами. В результате выяснилось, что иностранному туристу, для того чтобы совершить путешествие по белорусской части Августовского канала из Польши в Литву, нужно поставить свою подпись на ваучерах, договорах, в Книге по технике безопасности и других документах, общее количество которых доходит до 15.

По словам Сергея Коледы, бюрократическое нагромождение требований различных ведомств создает препятствия для привлечения туристов в туристическую зону, сообщает БЕЛТА.

Адумаліся?

У Міністэрстве адукацыі не выключаюць увядзення з новага навучальнага года ў ВНУ абавязковага курса прафесійнай лексікі беларускай мовы.

Прэс-сакратар Мінадукацыі **Віктар ІЎЧАНКАЎ** зазначыў, што на працягу навучальнага 2006/2007 года рэктараты вышэйшых навучальных устаноў самастойна вырашалі пытанне аб неабходнасці ўвядзення для тых ці іншых спецыяльнасцяў курса прафесійнай лексікі беларускай мовы за кошт гадзін, якія адводзяцца ў вучэбных планах на спецкурсы і факультатывы. *"Але з месцаў выказваюцца прапановы вярнуць курс прафесійнай лексікі беларускай мовы ў абавязковы кампанент адукацыйных стандартаў ВНУ. Верагодней за ўсё, так яно і будзе, і ў новым навучальным годзе ў пералік абавязковых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін будзе ўключаны невялікі па колькасці гадзін курс беларускай мовы (прафесійная лексіка)",* — сказаў Віктар Іўчанкоў.

Марат ГАРАВЫ.

АДУСЮЛЬ

Міністр пераблытаў даклад

25 чэрвеня міністр фінансаў Мікалай Корбут прэзентаваў На цыянальнаму сходу адразу два законапраекты.

Калі спадар Корбут пачаў чытаць даклад па першым пытанні, спікер парламента Уладзімір Канаплёў насцярожана пацікавіўся, ці не пераблытаў міністр пытанне. Аднак Мікалай Пятровіч працягнуў свой даклад.

Дэпутаты пасля выступу задавалі пытанні, а потым прагаласавалі "за". І толькі пасля гэтага высветлілася, што сапраўды законапраекты ўсё ж такі пераблыталі. Міністр дакладваў пра адно, а дэпутаты галасавалі — за другое.

У выніку, галасаванне прыйшлося адмяніць. Але ў другі раз дэпутаты зноў націснулі пімпы "за".

Віншуем!

Самая старая жыхарка Беларусі Ганна Паўлаўна Рагель 4 ліпеня адзначыць свой 118-ы дзень нараджэння. Яна нарадзілася ў 1889 году ў вёсцы Белыя Маладзечанскага раёна, а зараз жыве ў прыватнай хаце ў горадзе Маладзечна разам з дачкой-пенсіянеркай.

У Міністэрстве працы і сацабароны адзначылі, што па звестках на 1 красавіка, 100-гадовую мяжу перасягнулі 696 беларусаў. 14 з іх адсвяткавалі 110-гадовы юбілей.

Сярод доўгажыхароў пераважаюць прадстаўніцы жаночага полу — 100-гадовую ўзроставую планку пераадолелі 596 жанчын і толькі 100 мужчын.

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

Как БТ рождает «звезд белорусской оппозиции»

Если тебя узнают на улице — значит, ты ЗВЕЗДА. Это аксиома. Белорусское телевидение продолжает свою программу "Фабрика звезд белорусской оппозиции". Я сделала этот нехитрый вывод после того, как ко мне (провинциалке) в Минске подошел мужчина немолодых лет и с ненавистью в глазах сказал, что он видел меня по телевизору. Я догадалась, ЧТО он видел, и даже смогла представить, ЧТО он мог слышать в комментарии за кадром. Но обо всем по порядку.

Помощница г-жи Стюарт — посла Соединенных Штатов — позвонила мне, чтобы попросить о встрече в Дзержинске во время поездки посла по району с целью посещения музея Ф.Э.Дзержинского на его родине в Дзержиново. Естественное стремление официального лица другого государства — как можно больше узнать о стране пребывания — вызвало нервную реакцию со стороны местных чиновников и спецслужб.

Наша встреча в кафе "Колос" проходила под прицелом видеообъектива папарацци с Первого национального телеканала и негодующего взгляда мелкой чиновницы из отдела по идеологии Дзержинского райисполкома Нины Сергеевны Жензеровой. Еще одно лицо с внешними данными *"бойца невидимого фронта"*, по всей вероятности курирующего спецоперацию по перемещению иностранного посла, осталось, как и полагается, неидентифицированным.

Каюсь. Первый раз позавидовала умению А.Г.Лукашенко *"работать на камеру"*. Лично для меня даже разговор о впечатлениях Карен Стюарт от посещения музея, о погоде и о гражданском обществе в Беларуси под прицелом объектива вызывал дискомфорт. Сказался недостаток опыта публичного политика. Тем более я понимала, КАКИМ образом данная картинка может быть прокомментирована за кадром. Мы были бессильны избавиться от любопытных глаз в публичном месте. Они вели себя, будто назойливые мухи. Мысль, которая спонтанно возникла, была вызвана как желанием пощекотать нервы непрошенным участникам встречи, так и показать им, что наглость и бесцеремонность имеют предел. И я пригласила госпожу посла на чашку чая ко мне домой...

Представьте себе реакцию жителей провинциального городка, когда через центр города следует эскорт из машины посла США с государственным флагом, машины сопровождения ГАИ с мигалкой, исполкомовской "Волги" гос.№5693 АС-5 и машины "ТВ-пресса" гос.№0561 МАХ. Вся эта кавалькада останавливается у моего дома, а выбегающие из машины *"прочие официальные лица"* и пресса делают попытку войти не только на территорию моей частной собственности, но и прослеживается явное желание стать потребителями халявного чая. Естественная моя реакция — указать, что я не позволяю им находиться во дворе моего дома. Что и было сделано. Нервная реакция свидетельствовала, что мой план достиг цели.

Перед тем как войти в дом, я наглядно продемонстрировала Карен Стюарт, как выживают белорусы в период *"экономического подъема"*. Грядки с луком, морковкой, теплица, где произрастают 160 саженцев помидоров, 30 саженцев перца, полоска огурцов и прочая зелень, были доказательством того, что голод нам не грозит. Не потому, что тот, кто *"выше Бога"*, заботится о каждом чаде своем, а вопреки *"заботам"* последнего и его усилиям по лишению льгот самых незащищенных групп белорусских граждан, студентов, по уничтожению предпринимателей как класса. Белорусы всегда надеялись только на себя. Единственное, что пока мешает, — врожденное чувство страха у старшего да и у среднего поколений нашего общества. Избавившись от этих цепей, поверьте мне, каждый почувствует невероятное облегчение и главное, что обретет, — здоровье, потому как даже авторитетные медики констатируют: в основе любого заболевания лежит страх, который вызывает блокировку регуляторных механизмов и спазмы капилляров.

В общем, особо любопытным чиновникам признаюсь, как на духу: с послом мы говорили о жизни. О том, как трудно людям выживать в условиях нереформированной экономики, когда, например, продукция местной швейной фабрики "Элиз" пользуется спросом во многих странах мира, а женщины, шьющие конкурентноспособную продукцию, получают гроши. При этом отношение к ним как к рабыням. Сказывается отсутствие нормальных профсоюзов, призванных защищать интересы работников наемного труда. О вконец *"запущенных"* заводах, из числа которых повезло только моему родному ДЭМЗу, который вовремя сумел прилепиться к МАЗу. Да и у них, говорят, в последнее время дела идут не очень...

Говорили о грязной воде, содержание железа в которой в несколько раз превышает допустимые нормы, в чем воочию могла убедиться госпожа посол. Ржавчина на эмали в ванной не сдает своих позиций даже перед *"силитом"*, не говоря о прочих *"кометах"* и *"чистолях"*. А ведь людям приходится пить такую воду! О разбитых дорогах и проездах во дворах (за исключением тех, по которым ездит начальство). Об отсутствии у людей права на достоверную информацию. О насаждении тотального страха и контроле за инакомыслящими в городе. Демонстрацией этого служили действия чиновников и подконтрольных власти СМИ. О лжи и вранье — главном оружии авторитарного правления, противопоставить которому мы можем только свою внутреннюю свободу и желание изменить мир вокруг себя.

Я намеренно не называю имена других участников встречи. Не потому, что спецслужбы не знают, кто это. Чтобы лишний раз не раздражать власти придержащие. Хочу только предупредить всех желающих *"делать"* ЗВЕЗД: не надо мне помогать, я справлюсь сама. Тем более что из нескольких источников мне сообщили, что поступило указание искать на меня компромат. Как ни крути, поиск компромата на оппозиционных политиков — первый признак грядущих выборов. Так что нас ждут интересные времена...

Меня всегда умиляло желание вроде бы не глупых людей заниматься бесперспективным делом. Это все равно что гонять ветер. Чтобы облегчить вам поиск, подскажу: я не занимаюсь бизнесом, не подписываю финансовых документов, не собираюсь оскорблять ни президента, ни даже вас. В моем лексиконе достаточно слов, чтобы выразить свою мысль корректно, но точно.

Напротив, я предлагаю диалог. Диалог по существу. Не касаясь личных принципов, так как понимаю, что у разных людей они различны. За вами формально власть, за мною — люди. Можно, конечно, пробовать, кто сильнее: власть или люди. Но, поверьте мне, в борьбе за свои собственные интересы сила людей увеличивается стократно. Это наглядно показал 2004 год, когда чиновники из ЖКХ не просчитали или не захотели спрогнозировать реакцию на свои противозаконные действия.

Давайте говорить о том, как сделать жизнь жителей нашего города достойнее или хотя бы чуть-чуть легче. Как добиться того, чтобы проект по строительству станции по уменьшению содержания железа все-таки был подписан и строительство началось в сентябре, как было озвучено на сессии районного Совета. Я не стану весь перечень проблем в городе делать публичным. Я не буду озвучивать, кто и как из высших чиновников города решает свои личные проблемы. Ибо если в качестве очередных *"крайних"* выберут вас, мне легче не станет, это точно. Придется долго привыкать к новым лицам...

Татьяна ВАНИНА,
жительница г.Дзержинска.

КРИМИНАЛ

Еще одна банда на Гомельщине

В Жлобине раскрыта деятельность нескольких преступных групп насильственной направленности, которые на протяжении ряда лет занимались бандитизмом и совершали разбои. Сотрудниками управления Комитета государственной безопасности по Гомельской области по данным фактам уже возбуждено 18 уголовных дел.

Как сообщила пресс-группа областного УКГБ, оперативно-следственные мероприятия по деятельности данных преступных групп начались в январе текущего года. Была получена информация о том, что члены формирований совершают разбойные нападения на людей, которые занимаются сбором лома цветных металлов с территорий, прилегающих к республиканскому унитарному предприятию "Белорусский металлургический завод". Под угрозой применения насилия последние должны были вносить в *"общак"* часть прибыли, полученной от реализации лома. К тем, кто отказывался, применялись меры физического воздействия. Участники преступной группы располагали охотничьим ружьем и пневматическим пистолетом, приобрели камуфлированную форму и маски, разработали способы связи. Обязанности членов группы были строго распределены, а преступные операции планировались заранее.

По предварительным данным, членами формирований совершен ряд тяжких преступлений, среди которых разбои, вымогательства, бандитизм, принуждение к участию в преступной деятельности. Так, одной из групп на протяжении 1998—2004 годов систематически совершались вымогательства у предпринимателей и лиц, занимавшихся незаконными валютными операциями. Члены другой группы в течение 2002—2007 годов принуждали работников Белорусского металлургического завода к совершению краж и хищений товарно-материальных ценностей предприятия путем злоупотребления служебными полномочиями. Доходы, полученные участниками групп незаконным путем, использовались для поддержания и развития преступной деятельности.

В настоящее время по подозрению в совершении этих тяжких преступлений задержано 11 местных жителей. Работа по выявлению остальных фактов преступной деятельности, а также других участников преступных групп продолжается. В пресс-группе добавили, что граждане, которые желают оказать помощь следствию, могут обращаться по "телефону доверия" УКГБ по Гомельской области **79-23-31**, КГБ Республики Беларусь **(8-017) 219-92-99**. При этом гарантируется полная конфиденциальность.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

СЛЫШАЛИ?

Налоговые платежи «Белтрансгаза» формируют 15 процентов бюджета Минска

Что же будет в столичном бюджете, если этим предприятием завладеет российский “Газпром”? Пока есть договоренность о приобретении им половины “Белтрансгаза”. Нетрудно прикинуть, какие финансовые потери даже от этого понесет Минск.

Два трактора в ЮАР

Минский тракторный завод поставил в ЮАР два трактора для проведения сертификации и оценки соответствия национальным техническим требованиям. Об этом БелаПАН сообщил заместитель маркетинг-директора РУП “МТЗ” по коммерческой работе на рынках дальнего зарубежья Николай Дубовец.

По его словам, в этом году МТЗ примет участие в выставке сельхозтехники в ЮАР, на которой, возможно, будет обсуждаться вопрос о создании сборочного производства тракторов в этой стране, а также о возобновлении поставок белорусских тракторов (МТЗ не поставляет продукцию в ЮАР с 1993 года).

И так берут не очень

Представители Оршанского льнокомбината заявили, что отмена преференций для предприятия “достаточно болезненна”. На предприятии это связывают с большой долей экспорта в страны дальнего зарубежья.

“Порядка 78% объема экспорта приходится на эти страны, среди которых большинство — страны Европы”, — сообщили БелаПАН на комбинате. — *“Наша продукция станет незначительно, но дороже, а ее и так берут не очень охотно, мы даже не выбираем установленные квоты”.*

Предприятие ищет выход из сложившейся ситуации и планирует переориентироваться на рынки России и СНГ. *“Сейчас проводится активная работа по наращиванию экспорта в Армению, Азербайджан, Молдову. Но мы понимаем, что переходный период по диверсификации экспорта будет сложным”,* — отметил специалист предприятия.

Импорт зерна увеличен в 2 раза

Беларусь увеличила импорт зерна в январе—апреле на 83,8% к январю-апрелю 2006 года до 302,7 тысячи тонн при росте стоимостного объема в 2,1 раза до 62,1 миллиона долларов. Об этом агентству ПРАЙМ-ТАСС сообщили в Министерстве статистики и анализа.

Более 95% зерна — 292,3 тысячи тонн — Беларусь приобрела на рынках стран СНГ. Наибольший объем поставил Казахстан — 135,6 тысячи тонн (рост в 8,9 раза) на сумму 23,7 миллиона долларов (в 10,6 раза больше). Объем импорта зерновых культур из Украины составил 92,4 тысячи тонн (+2,4%) на сумму 18,7 миллиона долларов (+88,9%). Импорт из России в январе-апреле увеличился в 3,5 раза до 58,9 тысячи тонн, в стоимостном выражении — в 2 раза до 12,5 миллиона долларов.

Согласно сообщениям из Брюсселя, в договоре будут учтены возражения всех сторон. Однако порядок и форма принятия поправок в общеевропейские процедуры, предложенные, в частности, Польшей, Великобританией и Голландией, имеют свои особенности. Как передают агентства, переход к новому подсчету, в котором заложена "польская формула", произойдет не сразу, а в течение десяти лет — с определенным переходным периодом. Принципиальные возражения Великобритании в отношении сохранения суверенитета внешней политики, юстиции, внутренних дел переговорщики учли. Кроме того, Голландия добилась усиления роли национальных парламентов в решении вопроса о расширении ЕС. Вероятно, эта практика усложнит порядок приема.

Среди других важных компромиссов — изменение в структуре высших руководящих органов ЕС, на которых настаивали некоторые страны. Из кругов, близких к переговорам, сообщают, что в документ войдут некоторые положения, которые не удалось в свое время согласовать в качестве текста общеевропейской конституции. Таким образом, реально договор может стать даже большим шагом вперед в общеевропейской интеграции, чем конституция. В числе предусмотренных мер — введение новой должности представителя ЕС по внешней политике с широкими полномочиями, поста выборного председателя Европейского Совета.

ЛАТВИЯ

Мечтают утроить зарплаты

Массовое бегство жителей из Латвии может сократиться в том случае, если средняя зарплата местных трудящихся будет примерно втрое выше, чем сейчас.

Об этом со ссылкой на исследование Министерства экономики республики сообщает радиостанция MIX FM. Тем временем, по данным аудиторской компании Deloitte, в прошлом году средняя годовая зарплата в Латвии после уплаты налогов составляла 6222 евро, а в Ирландии, куда едет большинство гастарбайтеров, — 30.938 евро.

Именно различия в оплате труда являются одной из главных причин отъезда жителей из страны.

Между тем точка зрения о том, что из страны уезжают в основном низкоквалифицированные сотрудники, не нашла подтверждения. Как показало исследование, на заработки за кордон стремятся и люди с разным образованием, разного возраста и из разных регионов Латвии.

Согласно прогнозам исследователей, в течение ближайших 5 лет темпы эмиграции постепенно снизятся, в свою очередь оплата труда вырастет. Причиной тому станет увеличивающийся дефицит рабсилы.

ЭВРИКА!

Создана машина, которой не нужно топливо

В Индии начинается производство автомобиля, работающего на чистом воздухе. Стоимость запаса "горючего" на 200 км пути составляет 2 доллара. Индийская компания Air Car приступает к производству автомобиля, работающего на чистом сжатом воздухе и принципиально не способного из-за этого загрязнять окружающую среду.

Автомобиль на одной заправке может преодолеть расстояние около 200 км со скоростью около 100 км/ч. Заправка полного "бака" занимает несколько минут на компрессорной станции (или 4 часа с помощью встроенного электрического компрессора), стоимость полной заправки — всего 2 доллара. Предполагается, что уже в 2008 году по дорогам Индии будут ездить уже 6 тысяч машин Air Car.

Впечатляющих характеристик удалось достичь за счет облегчения конструкции машины. Ее корпус сделан из пластика, соединения — клеевые.

Не загрязняя воздух сам по себе, Air Car будет нуждаться в электрической энергии для заправки сжатым воздухом, однако в этом случае загрязнение окружающей среды будет сконцентрировано вне городских территорий.

Более подробная информация о перспективной разработке индийских инженеров будет представлена на портале "Наука и разработки — R&D.CNews".

Заплатил более 3 миллионов долларов за автомобильный номер

Эмиратский обладатель самого дорогого в мире автомобильного номера Талал Хури купил себе еще один дорогой номерной знак. За металлическую регистрационную пластинку с цифрой "7" он заплатил на аукционе автомобильных номеров в Абу-Даби 11,4 миллиона эмиратских дирхамов (более 3,1 миллиона долларов).

На проходившем в эмиратской столице в мае первом аукционе предприниматель не пожалел 25,2 миллиона дирхамов (почти 6,9 миллиона долларов) за номерной знак с цифрой "5", установив абсолютный рекорд мира.

Индийский фермер в 38-й раз провалил школьные экзамены

Индийский фермер, поклявшийся не жениться, пока не окончит среднюю школу, провалил школьные экзамены в 38-й раз, сообщило агентство "Рейтер".

Мысль получить среднее образование пришла к Шиву Шарану Ядаву в 30 лет, и с тех пор, с 1969 года, он сдает экзамены, с которыми справляются 15-летние школьники, но до сих пор все его попытки оказывались безуспешными. В этом году он сдал экзамен по санскриту, но провалил все остальные, набрав только 103 балла из 600. По словам 73-летнего ученика, ему особенно трудно дается математика.

ФОТООКНО

Куба сегодня

Те, у кого нет автомобилей, используют гужевой транспорт. Лошадь в хозяйстве кубинца — это и средство передвижения и способ заработать на туристах.

Дефицит топлива и стремление к экзотике породило еще одно средство передвижения по кубинской столице — смешные желтые трехколесные моторикши.

Карнавал — неотъемлемая часть кубинского образа жизни. Даже когда нет традиционного карнавала, обычно проходящего на Кубе в августе, островитяне умеют радоваться жизни.

РИА Новости.

Парижская мыльная опера

Герои сплетен — президент и бывший кандидат в президенты

Европейские СМИ не обходят стороной сплетни вокруг наиболее известных и авторитетных политиков Франции. Вот фрагменты из сообщений только некоторых из них.

Мельница слухов

Любовница французского президента скоро родит ему внебрачного ребенка, меж тем как его элегантная, эффектная крутого нрава жена появляется в Елисейском дворце лишь время от времени, чтобы соблюсти приличия. Сексапильная кандидатка от социалистов, проигравшая выборы, ушла от гражданского мужа, который заодно является ее шефом в партийной иерархии, и крутит роман со знаменитым писателем...

Если вы заглянете в Интернет или послушаете, что обсуждают за столом французы, вы поймете, что герои этих сплетен — Николя Саркози и Сеголен Руаяль, прославившиеся на весь мир этой весной благодаря захватывающему поединку на выборах.

Разумеется, все эти истории — домыслы. В Великобритании и других странах, где средства массовой информации ведут себя пронырливо, они были бы проверены и получили бы достоверные подтверждения — или нет. Но во Франции вместо СМИ на полную катушку работает мельница слухов. Тому есть две причины. Во-первых, страна увлечена двумя супружескими парами на верхних ступеньках иерархии публичных людей и у французов попросту разгорелась фантазия, тем более что жизнь правящей элиты по-прежнему скрыта под покровом секретности. Во-вторых, ходят слухи, что Саркози оказывает нажим на журналистов и через своих друзей, которым принадлежат СМИ, предотвращает публикацию нежелательных статей.

49-летняя Сесилия совершенно равнодушна к своему новому статусу первой дамы Франции. На инаугурации мужа главное внимание привлекала к себе мадам Саркози — высокая, одетая в кремовое платье от Prada — кстати, она бывшая фотомодель. Она появилась в окружении троих своих детей. Было заметно, что она чувствует себя неловко, меж тем как новоиспеченный глава государства явно старался к ней подольститься. Когда Саркози погладил жену по щеке, она отдернулась и в течение почти всей церемонии сохраняла хмурый вид. Вся Франция знает, что Сесилия, неделями не появляющаяся на публичных мероприятиях, вернулась к Николя полтора года назад после связи с Ришаром Аттиа, специалистом по пиару.

Даже угрозы судебных разбирательств вряд ли помешают развертыванию сетевой "мыльной оперы" о жизни семейств Руаяль и Саркози. Сплетни о французских правителях никогда не считались ни с цензурой, ни с общественными табу. Непристойные истории об оргиях и прочих похождениях жены правителя целенаправленно распространялись с политическими целями: примерами тому могут служить случаи Марии Антуанетты в 1780-е годы и жены президента Помпиду в начале 1970-х.

Сегодня стены дворцов рушатся благодаря Интернету и культу знаменитостей. Президент больше не может рассчитывать на ту опеку, благодаря которой покойный Франсуа Миттеран содержал за счет государства свою вторую семью — любовницу Анн Пинжо и дочь Мазарин.

The Times.

Настал момент все прояснить

В интервью, переданном 18 июня радиостанцией France Inter, Сеголен Руаяль заявила, что расстается с Франсуа Олландом, от которого у нее четверо детей. Это заявление вызвало беспокойство и раздражение в Социалистической партии и среди видных политических деятелей, которых новость застала врасплох.

— Добрый день, вы решили сегодня придать гласности решение частного и политического характера...

— *(Вздыхает.)* Последнее время появилось много домыслов обо мне и Франсуа Олланде. Я думаю, что настал момент все прояснить. Я бы хотела просто сказать, что мы решили больше не быть вместе. Нам, как и многим парам, знакомы трудности. Я решила взять эти трудности в скобки на время президентской кампании и кампании по выборам в парламент. Мне это было необходимо, чтобы защитить моих детей. Мне кажется, что сегодня мы переходим к новому этапу, и важно назвать вещи своими именами, будь то в наших отношениях или отношениях с другими. Я не буду рассказывать о подробностях нашей семейной жизни, но я действительно предложила Франсуа жить своей собственной жизнью, и он согласился. Это развод de facto: мы уже не живем в одном доме, и я думаю, что это соответствует реальности наших отношений.

— Почему вы все-таки решили об этом заговорить, хотя всегда очень строго относились к вопросам о личной жизни? На протяжении всей кампании мы видели Сеголен Руаяль, которая не хотела, чтобы говорили о ее браке и детях... Почему сегодня?

— На это есть личные причины, о которых я не буду говорить, но есть и публичные причины, связанные с многочисленными вопросами о наших отношениях и влиянии, которое они могли оказать на политическую жизнь. В какой-то момент у меня возникла потребность в правде, ясности и прозрачности.

Радио France Inter.

Они хотят, чтобы их оставили в покое

Социалистическую партию продолжают волновать эмоции, сплетни, слухи, связанные с расставанием Франсуа Олланда и Сеголен Руаяль.

Оба соцлидера подтвердили то, что было очевидным для всех: разлад в личных отношениях в конечном итоге отравил отношения политические. Было прекрасно видно, что отсутствие отношений между Франсуа и Сеголен порой создавало политические проблемы. Это чувствовалось, это было препятствием. Это был "Бермудский треугольник" социалистов.

Бывшие супруги предупредили: они хотят, чтобы их оставили в покое. Но блоггеров эта просьба не впечатлила, и все смогли узнать, о чем говорят в парижских салонах: женщина, завладевшая сердцем Олланда, — журналистка из Paris Match Валери Триервейле. Народная молва приписывает им сына и называет секретаря великим искусителем.

В заявлениях Руаяль многие отметили два пассажа. Первый — твердое намерение стать секретарем партии. Второй — очень важная фраза о бывшем супруге: "Я ничего не буду предпринимать против него". Неожиданно популярность Олланда среди руководителей партии усилилась. В ближайшем будущем она может стать щитом, который помешает Руаяль восстановить контроль над партией. Секретарь намерен оставить свой пост лишь через год, а в оставшийся период будет играть ключевую роль в партии. И теперь многие признают его "полезность", даже те, кто раньше хотел его отставки, теперь используют по отношению к нему более умеренные выражения.

Иными словами, пара Олланд—Руаяль будет оставаться в центре политических игр и играть центральную роль в процессе возрождения левых сил, чего все, по меньшей мере на словах, громко требуют.

La Repubblica.

Чавес ляціць у Мінск за зброяй

Прэзідэнт Венесуэлы распачаў сваё замежнае турнэ, падчас якога ён збіраецца наведаць і Беларусь. Ні венесуэльскія ўлады, ні беларускія канкрэтную дату візіту пакуль не паведамляюць.

Тым не менш сам Уга Чавес свой прыезд у Мінск ужо анансаваў. Паводле паведамленняў інфармагенцтваў, як заявіў Чавес, венесуэльская дэлегацыя мае намер разгледзець канчатковыя дэталі кантракта, які дазволіць ягонай краіне атрымаць комплексную сістэму супрацьпаветранай абароны з дальнасцю дзеяння 200—300 км.

Нагадаем, што Уга Чавес прыязджаў у Мінск год таму — у ліпені 2006-га.

Дарэчы, нават калі гэтым разам Уга Чавес усё ж не даляціць да Мінска, днямі ён усё адно зможа пабачыцца з Аляксандрам Лукашэнкам. У Растове-на-Доне, куды расійскі прэзідэнт Уладзімір Пуцін на 29—30 чэрвеня запрасіў калег з краін СНД і венесуэльскага лідэра. Зрэшты, як лічаць аналітыкі, для Лукашэнкі больш важна было б сустрэцца там з Пуціным...

НОВАЯ ОПАСНОСТЬ

Я больше никогда не подойду к этой реке

В местных водах живут и аллигаторы-людоеды, и акулы с зубами, острыми, как бритва. Но теперь жителей Флориды подстерегает новая опасность — летающая рыба. Об этом рассказывает Daily Telegraph.

Доисторическая рыба в буквальном смысле запрыгнула на вершину списка опасных животных солнечного штата: в ходе нескольких инцидентов она покалечила десятки людей на реке. Представители Комитета по дикой природе штата Флорида (FFWC) начали кампанию с целью предупредить людей, что столкновение с "бронированным" осетром может окончиться в кабинете хирурга.

Порой жертвы падали за борт, теряли сознание от удара или даже оказывались в коме после удара твердокаменной чешуей атлантического осетра. Эти рыбы живут в реке Суонни и иногда совершают прыжки над водой. В числе травм, нанесенных этими существами, значатся трещина позвоночника, повреждение легкого и горла, порванная селезенка, сломанные ребра и ранения, потребовавшие вмешательства пластического хирурга.

Некой женщине после одного из таких инцидентов потребовалось вправить три пальца, а еще один — ампутировать. Двое мужчин получили многочисленные ранения, когда врезались на лодке в мост, стараясь уйти от удара выпрыгнувшего из воды осетра.

"Эта рыба не стремится причинить вред — это не нападение, это столкновение", — объясняет майор Брюс Хэмлин, возглавляющий работу FFWC на севере и в центре штата.

"Временами осетры начинают часто прыгать, а когда уровень воды низок, простор для маневра ограничен, так что и людям на лодках, и рыбам приходится плавать в одних и тех же местах".

"У этих рыб чешуя напоминает защитную броню, вот и получается, как будто вы едете на мотоцикле со скоростью 35 миль в час, а кто-то бросает вам в лицо 100-фунтовую бетонную плиту", — рассказывает он.

Не совсем понятно, что заставляет осетров заниматься акробатикой, однако известно, что их прыжки в основном приходятся на июнь—август.

За прошедший год на реке Соунни были госпитализированы 10 человек, получивших ранения из-за столкновения с осетром. С начала нового летнего сезона уже ранены двое. Одной из жертв стала женщина, которую рыба весом в 130 фунтов сбросила за борт яхты.

"Мы опасаемся, что пока осетр только разминается", — предупреждает майор Хэмлин.

В прошлом году одной из жертв стала 32-летняя Дон Пуарье, владелица салона красоты в Кеннет-сити, штат Флорида. Она плавала на лодке со своим другом, когда осетр длиной 6 футов вылетел из воды, ударил ее по лицу, разбил двигатель лодки, рухнул обратно в воду и уплыл восвояси.

Женщина пришла в сознание лишь через две недели, после чего ей пришлось обращаться к пластическим хирургам для восстановления одной стороны лица. "Я была в коме. Не помню 15 дней своей жизни, — рассказывает Пуарье, мать двоих детей. — Вся моя жизнь изменилась из-за рыбы".

Миссис Пуарье в течение шести недель носила шину из-за перелома челюсти, она страдает из-за провала в памяти, а счета за лечение составили 130 тыс. долларов . "Когда эта рыба прыгнула, меня будто сразу ударила тысяча лезвий. Я больше никогда и близко не подойду к этой реке", — говорит она.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
29 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

ЖУРНАЛІСТ МЯНЯЕ ПРАФЕСІЮ

Чырвоная, 23

Нататкі «чысцільшчыка»

Між сваімі яго называю “палігарф”. Праўда, да шпіянажу гэта не мае ніякага дачынення. Прасцей, таварышы, прасцей: ААТ “Паліграфкамбінат імя Я.Коласа”. Мне там давялося папрацаваць з ліпеня 2006-га па люты 2007 года. У якасці грузчыка. Цікавы быў час. Павучальны. Як журналісту, які часта пісаў на тэму “Чалавек і эканоміка”, мне пашанцавала. Працуючы ў рэдакцыі, пра гэта можна было толькі марыць. А тут жыццё зрабіла такую загагуліну, што мара здзейснілася. Ну а былых журналістаў, як і шпіёнаў, не бывае.

Першая сустрэча

Хто не бачыў саліднага будынка камбіната? Той, хто не быў на плошчы Якуба Коласа. Так бы мовіць, яшчэ жывая рэшта таго, што называлася некалі СССР. Камбінат жа і будаваўся ў разліку, што ён будзе даваць прадукцыю не толькі для БССР, але і ледзь не для паловы Саюза. Добра будавалі, ды ўжо даўно, на пачатку 1950-х. У 1956 годзе камбінат запрацаваў. Якраз летась ён адзначыў 50-годдзе. Надрукавалі спецыяльны святочны альбом, выдалі прэміі (некаторыя таварышы тут жа іх прапілі), правялі ўрачысты сход у філармоніі, атрымалі віншаванне ад Лукашэнкі, арганізавалі абавязковую п’янку. Хаця яна пачалася напярэдадні, яшчэ ў пятніцу. Я тады працаваў дні тры. Стаў сведкам знамянальнай падзеі.

Майстар раптам загадала ісці на першы паверх, на кардоннарэзальны ўчастак. Там мы знайшлі чалавека, які спаў на лаўцы. Гэта быў дзядзька Вася, грузчык.

Свята ён ужо добра адзначыў, мяне прывялі на замену. Але — што значыць старая школа! — Вася прачнуўся і заявіў: усё добра, дапрацую. Па лесвіцы падняліся наверх. У адным месцы знайшлі чалавека, які спаў на прыступках. Першы раз бачыў, што можна спаць на бетонных прыступках. Уявілі? Больш, праўда, здзівіла майстар.

— Міхалыч, — яна спакойна, дзелавіта расштурхала мужыка. — Пад’ём, пад’ём. Ідзіце дадому, прагулу не будзе...

Той аўтаматычна ўстаў. Твар нічога не выражаў, вочы — бы ў іншапланецяніна. Адвык я ад такога. Хаця яшчэ ў савецкія часы папрацаваў і на кабельным заводзе, і на мэблевай фабрыцы, пабачыў усяго. Але што гэта значыць? Толькі тое, што за 20 год нічога не змянілася. Чым больш я працаваў на камбінаце, тым больш сцвярджаўся ў гэтай думцы. Хаця гэта і даказвае, што чалавечая псіхалогія мяняецца вельмі марудна. Яна ўвогуле не мяняецца, калі не мяняюцца ўмовы існавання. А яны змяніліся? Ну, быў проста камбінат, стаў акцыянерным таварыствам — якая розніца? Амаль ніякай. Мо толькі ўмовы сталі вельмі дрэннымі, амаль невыноснымі.

Калісьці на камбінат уладкавацца было не просцей, чым на мясакамбінат. Хачу нагадаць, асабліва маладым людзям, што ў тыя часы кніга была відам валюты. Яе можна было дорага прадаць, абмяняць і гэтак далей. Дырэктар кніжнага магазіна быў важным чалавекам. Ну а калі вы самі друкуеце кнігі, то... Ды што тут гаварыць!..

На дзвярах камбіната вось ужо сёмы год вісіць аб’ява аб наборы рабочых ледзь не па дзесятку спецыяльнасцяў. Нядрэнна б абнавіць, бо ўжо робіцца смешна. На той момант я быў згодны на любую работу. Маё становішча адпавядала англійскай прымаўцы: сыплюцца на Джона ўсе шышкі, і з сосен, і з елак. Што там выбіраць? Грузчык дык грузчык.

Адно мяне ўразіла: на работу прынялі ледзь не імгненна. Гутарка з начальнікам цэха заняла некалькі хвілін. Праўда, яго насцярожыў апошні запіс у працоўнай:

— А што ж вы пайшлі з газеты?

— Ды захацелася фізічна папрацаваць, — з усмешкай адказаў я. Па праўдзе кажучы, не хацелася ўдавацца ў інтымныя падрабязнасці.

— Ну а цялежкі... зможаце катаць?

— Змагу. Гэта я проста худы, але жылісты.

Пытанне начальніка было абгрунтаваным: вага грузу на цялежцы магла быць і паўтоны. Нічога, хутка прызвычаіўся. Людзі вунь і ў канцлагерах жывуць. Хаця далёка не ўсе выжываюць.

Знаёмства з аб’ектам

Накіравалі мяне ў пераплётны цэх, на крышачны ўчастак. Потым я даведаўся, што сюды ніхто не хоча ісці. Можа быць, справа ў лозунгах? У адным месцы вісіць *“Ні аднаго адстаючага побач!”*, у другім — *“Рэжым — дакладны, тэмпы — ударныя, якасць — выдатная!”*. Хто б сумняваўся! Ах, як знаёма, ажно сэрца зашчымела...

На крышачным участку робяць крышкі. Незразумела? Гэта тое, што называецца вокладкай. На самай справе гэта крышка. Саму вокладку машына наклейвае на дзве кардонкі — атрымліваецца крышка. Другая машына склейвае сфальцаваныя і збрашураваныя лісты. Вось вам і кніжка. Але гэта — у другім месцы і ў другі час, а пакуль крышкі.

Іх робяць на 6 машынах “Colbus”. Са здзіўленнем убачыў, што яны “Made in DDR”, ды яшчэ выпушчаны ажно ў 1981 годзе. Ім цяпер, значыць, па 26 год. Для чалавека, канешне, не ўзрост, а для жалезнай машыны? Мнагавата. Таму машыны раз-пораз ламаюцца і пачынаюць гнаць брак. Рамонтнікі на ўчастку — вельмі частыя госці.

— Ды іх, блін, нават у металалом ужо не прымуць! — аднойчы ў сэрцах выказаўся машыніст Коля.

Калі машына стаіць 2—3 гадзіны, то машыніст норму не зробіць. Адпаведна, атрымае менш. Пры камбінатаўскіх зарплатах — адчувальны ўдар. Ніхто мне толкам так і не сказаў, якая на камбінаце сярэдняя зарплата. Прыходзілася проста слухаць размовы.

Вось абсалютна дакладныя лічбы: адзін машыніст за снежань мінулага года атрымаў 387, другі — 450 тысяч. Ставіць пытанне, ці можна пражыць на такія грошы, нават няёмка. Праўда, начальства атрымлівае крыху больш. У іх — аклад і прэмія, рабочыя — здзельшчыкі. Дый потым, рабочых больш, чым кіруючых. А тыя, каго больш, атрымліваюць менш. І наадварот. У грузчыка аклад быў 270 тысяч, у ліфцёраў — 200, у нейкіх кантралёраў чагосьці — 190 тысяч. Хаця зарплата — хворае пытанне заўсёды і ўсюды, яшчэ вернемся да яго неаднойчы.

Грузчык — прафесія мабільная. Прыходзілася бываць амаль усюды. Іншы раз ставіў пытанне сам сабе: гэта, уласна, сучасная вытворчасць або музей старажытных сродкаў вытворчасці? Вось машына 1975 года выпуску, а вось — 1973-га. На першым паверсе, дзе склад паперы, удалося знайсці рэзальную машыну 1964 года. Здзівіўся і спытаў машыніста:

— І што, яна працуе?

— А ё... ...! — адказаў ён мне. — Ты не бачыш?!

Бачу. Машына пачала проста рваць матэрыял, які на ёй рэзалі. Кавалкі не выкідваюць — вылічаць з зарплаты. Асабіста я даў бы прэмію гэтаму машыністу за тое, што ён яшчэ не разбіў “сродак вытворчасці” кувалдай. Стойкі мужык.

Умовы выжывання

Курыца — не птушка, грузчык — не чалавек. Гэта я так трансфарміраваў вядомую прыказку. Зараз растлумачу.

Больш за усё грузчыкаў на другім і трэцім паверхах — там гатовая прадукцыя. На чацвёртым паўгода быў я адзін. У лепшыя часы было 6 чалавек... Кожны дзень прыходзілася ўставаць а палове шостай. З перасадкай ехаць са спальнага раёна ў цэнтр горада. І, пасылаючы праклёны ўсяму свету, прыступаць да выканання абавязкаў.

Вам яшчэ не надакучыла? Працягнем. Першай справай трэба было адвезці гатовыя крышкі ад машын і падвесці кардон пэўных памераў. 126х206 124х206, 137х217 і гэтай далей, усе памеры я, здаецца, запомніў на ўсё жыццё. Лепшаму запамінанню садзейнічала вага гэтых жалезных фур — 250—300 кг. Падкатваеш цялежку пад фуру, адгінаеш ручку да ўпору ўніз і паступова адпускаеш. Адразу нельга, калі ручка ўдарыць па руцэ ці назе, не выключаны пералом. Далей фуру трэба падвезці да той ці іншай машыны, пры гэтым манеўруючы, каб не ўрэзацца ў што-небудзь хрыбтом, не трапіць у яміну, не... Уменне прыходзіць за месяц-паўтара.

Добра, адна справа зроблена. Цяпер трэба спусціць на другі паверх дзве вялізныя скрынкі бракаваных крышак — вынік работы другой змены. Адходы ад вытворчасці выкідваюцца ў дзве ёмістасці, натуральна, уручную. Пад люкамі стаіць машына, туды і ляціць макулатура. Потым яе вязуць на перапрацоўку.

Работа брудная і цяжкая. Аднак, былі прыемныя, прама знакавыя моманты. Аднойчы прыйшлося выкідваць цэнтнеры два новых, небракаваных, заўважце, крышак. Проста лішнія аказаліся. Сярод Дар’і Данцовай, Сідні Шэлдана, “Нажоў свету” і іншых Дэнаў Браунаў сустрэлася белая раскошная крышка з залатым цясненнем: “Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь”. Ну, трэба ж! Выкідваў з асобым задавальненнем, бо добра памятаю гісторыю з яе прыняццем і што было потым. Адну крышку кінуў на брудную падлогу і паставіў “аўтограф” — адбітак падэшвы. Гэта не дзяржаўнае злачынства, а?..

Паехалі далей. Далей у мяне малатыражка, макетны ўчастак, лак... і зноў крышкі. Атрымліваўся такі бег па палаце перашкод. Бывала, адразу ў трох месцах патрабаваўся грузчык. Прыходзілася вырашаць: куды спачатку? Вось малатыражку я ўзненавідзеў. Гэта такі ўчастак, там даводзяць да розуму асабліва дарагія “заказныя” тыражы. Скажам, энцыклапедыя “Britanika”, “Аквары-умны свет” або “Я — мінчанін”. Трэба прывезці гэта, адвезці тое, а месца мала, не павярнуцца, а стэлажы страшна цяжкія, а кнігі раз’язджаюцца, не дай Божа, упадуць. “Britanika” — каштоўная, карысная кніга, але пад канец яна стала маім асабістым ворагам. Паспрабуйце правезці стэлаж з ёй з чацвёртага на другі паверх, дзе гатовая прадукцыя, і дзе месца практычна няма. Усё па таварышу Ч.Дарвіну, натуральны адбор, выжывае мацнейшы і г.д.

У першыя тыдні мяне непрыемна ўразілі адносіны да грузчыкаў. Мякка кажучы, не камільфо. Маглі груба крыкнуць, напрыклад. Потым я стаў адказваць адэкватна, Ісуса Хрыста з мяне, відаць, ужо ніколі не атрымаецца. Запажадалі. А я задумаўся: чаму так? Мы людзі другога гатунку? Патлумачыла адна ліфцёрша:

— Дык хто ж сюды ідзе? Яго, значыць, нідзе не бяруць, а ў нас толькі давай!

Ну я і трапіў... Але рабіць няма чаго, цягні сваю лямку. З поўным усведамленнем: так, ты трапіў на самае дно, на самыя камяні, у бруд. Ну і што? Гэта нават карысна. Ва ўсялякім выпадку ідэальны спосаб праверыць касцявыя тканіны на трываласць. Бо калі з вышыні падаеш на каменні, можна і не ўстаць. Таму ў падарожжах па цэху я абдумваў тэму, а па выхадных пісаў. Вельмі зручна: пасля вялікай фізічнай нагрузкі пішацца чамусьці лёгка — “вал натхнення”...

З часам, нарэшце, запомнілі маё імя. Са мною сталі абмяркоўваць праблемы, а калі прасілі аб чым-небудзь, дадавалі “калі ласка”. Іншы раз.

Хаця быў і грузчык Ігар. Цвярозым яго даводзілася бачыць даволі рэдка. У такі парадаксальны момант ён змрочна скардзіўся:

— Разумееш, чатыры прагулы, ё-маё...

— Запіў?

— Ну... Ды я і сам чатыры разы заяву падаваў! Не звальняюць, падлы... Няма каму, кажуць, працаваць.

Ігара-такі звольнілі па артыкуле. А праз месяц узялі назад. Працаваць сапраўды няма каму. На дзяржпрадпрыемствах падобнае — норма.

Парадак і яшчэ раз парадак

Афіцыйна працоўны дзень на камбінаце пачынаецца ў 6.50. Неафіцыйна — у 7.00. Тут шмат чаго робіцца неафіцыйна. Як быццам забаронена, але калі вельмі хочацца, то можна. Як і ў любым іншым месцы нашай маленькай утульнай дзяржавы. З аднаго боку, у нас ёсць гарант Канстытуцыі, дай яму Бог здароўя, а з другога — ён яе сам зміняў, што быццам бы ніяк не дапушчальна, але... можна. У свеце маленькіх людзей адбываецца тое ж самае. Усе прыдуманыя правілы і парадкі яны прыстасоўваюць да свайго жыцця. Каб яно было крыху больш камфортным.

Абед першай змены пачынаецца ў 11.40, заканчваецца — у 12.00. На справе ён звычайна завяршаўся а палове першай, калі-нікалі і ў 13.00. Тут ужо прыходзіла старшы майстар і разганяла мужыкоў, якія забівалі “казла”. Нармальная справа, а мне і лепш: работы няма. Гулялі мужыкі за сталом у вугле. Раз-пораз там з’явіліся пустыя бутэлькі з-пад “Афіцэрскай”. Пасля зарплаты рабочы клас, само сабою, спажываў пабольш. Нехта даходзіў да кандыцыі.

Здавалася б, парушэнне дырэктывы №1? Парушэнне. Звальняем? Не звальняем. Няхай працуюць. Камусьці ж трэба выконваць тэрміновы заказ? А машыністаў не хапае, а прастой адной машыны — страты, а стратаў на камбінаце і так вышэй крышы. Таму: мы вам даём жыць, а вы — нам. Захаванне ўзаемных інтарэсаў або кругавая парука? Назавіце, як хочаце, сутнасць не зменіцца.

Выпускалі народ роўна ў 15.20, ні мінутай раней. Сэнс? Парадак ёсць парадак. Знешні. А ўнутранага на камбінаце няма ўжо даўно. Наш дурдом, — пяшчотна называюць яго рабацягі.

Працягнем, аднак, экскурсію па паліграфкамбінаце. Між іншым, месца тут прыемнае, асабліва летам. Зірнеш у акно — ля помніка Коласу тусоўка маладых людзей з півам і дзяўчынкамі, ля філармоніі яшчэ адна. Чаго больш, піва або дзяўчынак, адразу не скажаш. Паглядзіш, уздыхнеш і каціш сваю цялежку далей. Дарэчы, на ўвесь цэх была адна спраўная цялежка. Астатнія пяць былі акуратна пафарбаваныя ў бурштынавы колер. Але не працавалі.

Да далейшых перамог і г.д.

У першы тыдзень работы на камбінаце на вочы мне трапілася адна паперка на дошцы аб’яў. Прачытаў і, прашу прабачэння, спёр. Для далейшага аналізу. Цяпер папера састарэла. Але яе дух захаваўся. Дух, я б сказаў, савецка-сацыялістычны. Усё ў свеце жыве па законе інерцыі. Рух, аднойчы нададзены прадмету, затухае паступова. Тут той жа выпадак.

Вывучаю паперку — і душа радуецца, паколькі ўсё сваё журналісцкае жыццё меў справу вось з такімі паперкамі. Няма ім цаны! У сэнсе, яны не вартыя нічога. Вось, напрыклад: тэмп росту аб’ёму вытворчасці ў супастаўных цэнах — 106,5%. Або: план па натуральных паказчыках — 100,4%. Вы што-небудзь зразумелі? Я — толькі тое, што план выкананы. Вось яшчэ: прыбытак склаў — 102.729 тыс. руб. Гэта ўжо больш зразумела, хаця прыбытак невялікі. Усе гэтыя лічбы — за студзень—сакавік мінулага года.

Цудоўныя лічбы, выдатныя паказчыкі. Але дзе ж, чорт яго дзяры, паказчык рэнтабельнасці, на мой погляд, самы галоўны? Яна ўвогуле ёсць, гэта рэнтабельнасць? Нічога пра яе не сказана ў загадзе дырэктара №118 п(д ад 28.04.06 г. А рэнтабельнасць — усяго толькі адносіны агульных прыбыткаў да агульных выдаткаў. Вылічваем з прыбыткаў выдаткі, атрымліваем чысты прыбытак. На жаль, аб выдатках у загадзе дырэктара не было ані слова. Таму аб сапраўднай рэнтабельнасці камбіната нічога не скажу. Мяркуючы па суме прыбытку (чыстага? агульнага?), рэнтабельнасць усё ж ёсць. Але якімі намаганнямі яе дабіліся, можна толькі здагадвацца. Гераічнымі, сама меней. У канцы года ледзь не кожная субота была “чорнай”. Хаця рабочыя былі задаволены: “Калі б не рабочыя суботы, хрэн бы мы што атрымалі!” Зразумела, у выхадны аплата двайная.

Да галоўнага эканаміста камбіната ў мяне з’яўлялася ўсё больш пытанняў. Ды як атрымаць на іх адказы? Я, канешне, журналіст, але пакуль у “афсайдзе”, па-за гульнёй. Шэраговага грузчыка проста пашлюць падалей і будуць мець рацыю. Прыйшлося зрабіцца Шцірліцам або, як кажуць у CIA, “кратом”. Інфармацыя ляжыць пад нагамі. Яе трэба ўбачыць і падняць.

У ліпені 2006-га адзначалі 50-годдзе камбіната. Адпаведна, з’явіліся загады аб прэміраванні і ўзнагароджванні. Прынцып выдачы і памер прэмій быў такі: калі стаж ад 3 месяцаў да 1 года, то прэмія складае 20 тысяч рублёў, ад 1 да 5 год — 30, ад 5 да 10 — 40, ад 10 да 20 — 50 і ад 20 год і вышэй — 70 тысяч рублёў. Такім чынам, розніца паміж 3 месяцамі і 20 і вышэй гадамі — усяго 50 тысяч. Што датычыць узнагароджання, то ўзнагародзілі 10 чалавек. Чым? Далі па 100 тысяч. А што, лагічна.

Ці трэба што-небудзь каменціраваць? No comments.

Размова з ліфцёрам пра эканоміку

Трэба сказаць, усе ліфцёры на камбінаце — былыя работнікі камбіната і пенсіянеры. Пенсія, канешне, такая, што 200 тысяч лішнімі не будуць ніколі. Бяруць толькі сваіх, праверaных? Хто б стаў браць на работу 70-гадовую бабулю, у якой чатыры ўнукі? Дарэчы, сярод ліфцёраў толькі двое мужчын. Па камбінаце карціна такая ж. Вышэйшы камандны склад — тут большасць мужчын. Сярэдняе звяно — амаль цалкам лепшая (яна ж слабая) палова. Жалезнае выказванне т.Сталіна “кадры рашаюць усё” трэба злёгку змяніць — бабы рашаюць усё.

Сівы, вусаты, імпазантны ліфцёр, назавем яго Пятровіч, аказаўся талковым суразмоўцам. Ветэран камбіната, ён усё яшчэ перажывае за яго, але ўжо спакойна, з доляй іроніі. Неяк я ў сэрцах сказаў: маўляў, яны што, на сметнік працуюць? Пятровіч усміхнуўся:

— Штосьці цябе сёння заганялі... — памаўчаў. — А чаму так шмат макулатуры? Глядзі, людзі працуюць без перапынку, асабліва бабы, так? А чаму? Добра, норму гоняць, трэба зарабіць, гэта зразумела. А хто такія нормы ўстанаўлівае? Начальства. А ім навошта? Майстру важна, каб ты больш зрабіў. Большы аб’ём — ёсць прагрэсіўка, прэмія. У іх аклад, яны аб’ём далі — ім прэмія. А рабочы на здзелцы. Не выканаў, заляцеў па п’янцы — яму прэміі не будзе. Зразумеў?

— Ды гэта я даўно зразумеў. А адходаў чаму столькі?

— А машыны старыя, брак гоняць! А друкарам, ведаеш, колькі раней на брак працэнтаў давалі? Во-ой... Вось у вас крышкі робяць. Наробяць больш, чым тыраж, а ўсё роўна запішуць, і ўсім заплацяць, і сабе прэмію намалююць. Шмат крышак добрых выкідваў?

— Хапала.

— Вось! Усе працавалі, усе штосьці рабілі, план зрабілі, а крышкі — у макулатуру! Ды нікога гэта не хвалюе... Усім па ... Дурдом.

Вось, зноў дурдом. Штосьці часта яго тут узгадваюць. У наступным рэйсе Пятровіч развіў тэму ўглыб:

— Вось у цябе цялежка. А 50 гадоў таму таксама цялежкамі вазілі. На табе ўзровень тэхнікі, бяры, працуй...

— Няма грошай, — працягваў Пятровіч. — Няма і не будзе. Я з адной нарміроўшчыцай гутарыў. Дык яна сама і сказала: “Мы ў страту сабе працуем. Адкуль грошам быць?”

Добрая тэма: грошай няма, але яны адкуль-небудзь бяруцца. Бо вытворчасць не спыняецца, зарплата невялікая, аднак выплачваецца, затрымкі на 3—4 дні ўсяго. Загадка. Доўга я яе разгадваў. І правільны адказ чамусьці выходзіў адзін — банкаўскі крэдыт.

Калі разабрацца, то большая частка беларускіх прадпрыемстваў трымаецца на паверхні дзякуючы крэдытам як камерцыйных, так і дзяржаўных банкаў. Яшчэ летась грошай у краіне хапала. Нафтагазавых грошай. Нейкі час гэта дазваляла даказваць усяму свету, што ў нас тут “беларускі эканамічны цуд”, а беспрацоўных 1,5%. Цяпер вось адмяняюць ільготы. Не, тым, хто забяспечваў міф, грошай яшчэ дадуць. Для астатніх надышлі hard times, цяжкія часы. Як вядома, Балівар не вытрымае дваіх.

Кажуць, дзесьці ў Шабанах будуюць новы паліграфкамбінат. Гэта выдатна, калі гэта так. Але тут узнікае зусім іншая праблема.

У Маскву, у Маскву!

У лістападзе мінулага года на камбінат прыязджала група з тэлебачання. Штосьці здымалі, з кімсьці гутарылі. Аказалася, з намеснікам дырэктара. Вечарам паказалі сюжэт у навінах. Аб чым гаварыла намеснік? Аб тым, што ўсе выпускаюць танную камерцыйную прадукцыю, а камбінат устрымліваецца. Шмат увагі надаецца выпуску беларускай літаратуры, дый увогуле, сур’ёзным, пазнавальным кнігам. Вось, напрыклад, выходзяць маляўнічыя альбомы, прысвечаныя абласцям Беларусі, гісторыі. Карацей кажучы, такому паліграфічнаму прадпрыемству аналагаў у свеце няма. Вось гэта дакладна. Ідэалагічна вытрымаенае інтэрв’ю.

Слухаць гэта было і смешна, і сумна. Хаця тут ёсць і праўда. Але ёсць і няпраўда. Бо грузчык не горш за дырэктара ведае, што друкуе камбінат і для каго. Таму што кожны дзень грузчык возіць кніжкі з месца на месца, а потым загружае імі аўтафуры, якія едуць па ўсім тут вядомаму маршруту — у Расію, у Маскву. А калі транспарту няма (вадзіцелі адмаўляюцца — нявыгадна, камбінат мала плаціць), прадпрыемства ўпадае ў ступар.

Ні для каго тут не сакрэт, што асноўныя заказы ідуць з Масквы. Што калі б не гэтыя заказы, камбінат даўно б збанкрутаваў. Не было б работы, не было б грошай, было б паўтысячы беспрацоўных? Прадпрыемства надта прыкметнае, у цэнтры горада. Закрый яго — шуму будзе шмат. Значыць, падкормліваць яго крэдытамі? А далей што? Калі ў камбіната не будзе заказаў, ён проста будзе стаяць, — вось у чым асаблівасць друкавання кніг. Станкі, штаны, машыны можна адправіць на склад. Кнігі не адправіш, бо спачатку іх трэба надрукаваць, а, каб надрукаваць, патрэбна, каб іх заказалі.

Камбінат так і задумваўся: матэрыялы, сыравіна ідзе з іншых рэспублік СССР, а ў Мінску ўсё заканчваецца кніжкай. Так яно і цяпер. Кардон вязуць з Алексіна і Балахны, паперу, фарбы — таксама. Ну а заказы, адпаведна, з маскоўскіх выдавецтваў, ЭКСМО, АСТ, ды шмат іх там. Але справа ў тым, што расійскі кніжны рынак даўно жыве па рынкавым законе: што купляюць, то і друкуем, і заказваем менавіта гэта. Пры чым тут ідэалогія?

Неяк з майстрам Ленай мы вазілі с 2-га на 4 паверх чарговы маскоўскі заказ, здаецца, “Рублёўскую кухню” Аксаны Робскі. Пытаю:

— Зноў Масква? А чаму яны пруць нам свае заказы?

Свае ж камбінаты ёсць.

— Таму што ў нас танней.

— І рабочая сіла танней?

— І рабочая сіла.

— Выходзіць, мы краіна трэцяга свету, бананавая рэспубліка?

— Выходзіць! — здзіўлена засмяялася Лена, праўда, горка засмяялася. Таму што гэта “бананавасць” занадта дакладна адбіваецца на яе заробках. Невялікіх.

Што ж, гэтым усё і павінна было скончыцца. На “Беларусьфільме” здымаюць “Каменскую” і іншых, на паліграфкамбінаце друкуюць Аксану Робскі і Дар’ю Данцову. Танна. Было б зразумела, калі б на камбінаце стаяла суперсучаснае абсталяванне і дазваляла знізіць сабекошт да ніжэй ніжэйшага, што прыцягвала б заказчыка. Але тут усё роўна наадварот. Дапатопна, архаічна, таму і танна...

Што ж датычыць беларускай літаратуры, наменнік дырэктара, мякка кажучы, крыху перабольшыла. Памятаю 2—3 выпадкі масавага выпуску: “Беларускай мовы” і “Беларускай літаратуры”, што зразумела. Мільгануле аднойчы Ядвігін Ш., Купала і Адамовіч, хтосьці з новаспечаных літаратурных начальнікаў, прозвішча якіх я нават не чуў. Усё. Астатняе — ідэалогія чыстай вады, інакш кажучы, шмат ілюстрацый і поўная адсутнасць думак. Шыкоўныя выданні, якія пераказваюць дасягненні абласцей у будаўніцтве незразумела чаго. Прынцып просты: аблвыканкам дае грошы і заказвае, камбінат бярэ і друкуе. Як вы разумееце, гэта прадукцыя да рэальнага жыцця ніякіх адносін не мае.

Часткі цэлага

Сёння зноў зламаўся ліфт. Ён унутры цэха і прызначаны для падачы клею с першага паверха. Без клею машына працаваць не можа. Таму майстар пяшчотна ўпрошвае:

— Калі ласка, з’ездзіце, прывязіце.

І машыністы па-сяброўску просяць, усміхаюцца. А чаго мяне прасіць? У прынцыпе, я чалавек добры, слабых не крыўджу, абараняю. Ад моцных. Але вазіць усё роўна трэба. Па дарозе ўзгадваю Шапенгаўэра: “Жыццё зусім цярпімае, але наўрад ці вартае родавых пакут”.

У клееварцы я ўпершыню. Моцнае ўражанне. Не ад памяшкання, яно звычайнае, а ад жанчын, якія там працуюць. Яны неверагодных памераў, сапраўдныя мастадонты. Але добрыя, з гумарам.

— Штосьці ліфт доўга не рамантуюць, — паведамляюць.

— Відаць, электрыкі хрэновыя, — інфармую.

— Ды ліфт х...! 50 гадоў яму! Яму на пенсію трэба па інваліднасці! Першая група!

...Камбінат — акцыянернае таварыства. Калісьці выпусцілі акцыі, раздалі работнікам. Потым запахла вялікім “бенцам”. Адміністрацыя заклікала: дапамажыце роднаму прадпрыемству. Амаль усе здалі свае акцыі добраахвотна, а ліфцёрша Аня не захацела:

— Скулы ім! — адказала яна на маё пытанне: чаму?

— Ну і што вам плацяць па акцыях?

— Ноль цэлых хрэн дзесятых! Мы ж страт-ны-я!

Тады навошта было ўсё пачынаць? Абсалютна ўсё правільна вы зразумелі — для стварэння бачнасці нейкіх рэформ. Апрача назвы, нічога не памянялася.

...Едзем з першага паверха на чацвёрты. На другім спыняемся. Раптам заходзіць Дзіма, запіхвае пад ватнік кніжкі. Скраў. Потым прадасць за паўцаны скупшчыку на “кропцы”. На гарэлку ў Дзімы заўсёды ёсць.

Аднаму грузчыку не пашанцавала. Кніжка, якую ён выносіў, каштавала 2 тысячы, а штраф яму ўляпілі на 500 тысяч. Сапраўды, не пашанцавала, АБЭЗ праводзіў рэйд.

...Ніна рэжа кардон, забяспечвае крышачны ўчастак. Даўно за ёй назіраю. Спачатку не мог зразумець: псіхічна нездаровая, ці што? Бо яна працуе не горш за машыну, без спынення, аўтаматычна. У яе план: вось столькі тысяч лістоў кардону парэзаць за змену. Іначай яна атрымае мала. Думаю, што рацыю ўсё ж маю: Ніна ўжо, калі казаць жартуючы, не зусім нармальны чалавек. Яе такой зрабіла гэтая работа. Нейкая першабытна-цяжкая, яна выцягвае рэшткі жыццёвага соку. “Кобра”, — кажа пра яе Вася, які Ніну абслугоўвае. Ён ужо на пенсіі. П’е практычна кожны дзень, іншы раз да аслупянення, да страты пачуцця рэальнасці. Яго часта ловяць, але нават дадому не адпраўляюць. Адправіш, а хто будзе за яго працаваць? Няма каму.

Тут шмат такіх пенсіянераў. Хрыбет калектыву. Няма ім куды ісці. Нідзе яны не патрэбны і нікому. Але ж — сыдуць. Тады — усё?

...Па камбінаце даўно ходзяць чуткі: маўляў, ён дажывае апошнія дні. Быццам бы яго купяць расіяне, перабудуюць, прывядуць у боскі выгляд. І зробяць тут казіно, гатэль і начны клуб. Доля ісціны, магчыма, і ёсць. Камбінат пакрыху прадае свае плошчы. У некалькіх метрах ад яго ўзнікае чарговы гандлёва-выставачны комплекс. Кажуць, на расійскія грошы. Лагічна. Калі мы не жадаем прачынацца і нарэшце пачынаць жыць, як увесь астатні свет, за нас гэта зробяць іншыя. Гэта нават добра, можа, і мы прачнёмся.

А іначай атрымаецца дакладна па Венічку Ерафееве: “...Все равно пригвожденность, ко кресту ли, к трактирной ли стойке...”.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

АКТУАЛЬНА

Я хачу ўзяць крэдыт...

Многія людзі ўсё часцей і часцей сталі карыстацца паслугамі банкаў для атрымання крэдытаў. Праўда, апошнія "крэдытныя" навіны не могуць радаваць. Шмат у якіх банках сума крэдытавання змяншаецца, а працэнт наадварот павялічваецца.

Карэспандэнт "Народнай волі" вырашыў даведацца, у якім банку можна ўзяць найбольш прывабны крэдыт і колькі грошай дадуць, калі ён, напрыклад, мае сярэдні заробак чыстымі 500 тысяч рублёў.

— Пры такім заробку вы можаце ўзяць на тры гады альбо 5 мільёнаў 840 тысяч рублёў пад 18 працэнтаў, альбо 3070 долараў ЗША пад 12 працэнтаў, альбо 2310 еўра пад 11 працэнтаў (у сакавіку давалі 2400 еўра), — у рэжыме аўтаадказчыка адказвае мне дзяўчына з даведачнага бюро **"Белагрампрамбанка"**.

— Пяць мільёнаў рублёў пад 17 працэнтаў, — інфармуюць у **"Пріорбанку"**. — Праўда, вам спатрэбіцца даведка аб заробку не за тры апошнія месяцы, а за паўгода. Альбо можаце ўзяць 1860 долараў пад 15 працэнтаў (у сакавіку давалі пад 13 працэнтаў). Еўра не выдаём...

— Чатыры мільёны пад 17 працэнтаў на ваш заробак, — далей змяншаюць суму ў **"Беларусбанку"**.

— Толькі тры мільёны пад 17 працэнтаў, — коратка, аднак ясна тлумачаць у **"Белзнешэканамбанку"**.

Дык чаму банкі змяншаюць памер крэдытаў ды павялічваюць працэнты, хоць нашы дзяржаўныя банкіры робяць аптымістычныя заявы адносна стабільнасці фінансавага рынку?

— Разумееце, рэсурсы многіх банкаў выкарыстоўваюцца для рэальнай эканомікі (прадпрыемстваў), — кажа экс-старшыня Нацыянальнага банка Беларусі **Станіслаў БАГДАНКЕВІЧ**. — У нас за мінулы год даўгі эканомікі банкам павялічыліся на 57 працэнтаў, а гэта вельмі шмат у той час, як нацыянальны прадукт павялічыўся толькі на 10 працэнтаў. Гэта значыць, што эканоміка неэфектыўная і няма звароту крэдытаў. Гэта я мяркую ўскосна, бо даўгі павінны расці на ўзроўні росту прадукту. Напрыклад, калі я ўзяў пазыку больш як на 10 працэнтаў, то і прадукту павінен выдаць на столькі ж больш. Натуральна, што ў нашай сітуацыі крэдытамі хутчэй за ўсё замяшчаецца непрададзеная прадукцыя. Неэфектыўныя прадпрыемствы бяруць і бяруць у банкаў крэдыты, туды рэсурсы і ідуць. Аднак, па вялікім рахунку, пакуль не павінна быць праблем з атрыманнем рублёвых крэдытаў для фізічных асоб. Іншая справа, што Нацыянальны банк павысіў на адзін працэнтны пункт стаўку рэфінансавання, а гэта азначае, што працэнт крэдыту для людзей зараз больш высокі.

— Многія людзі задаюцца пытаннем, як лепш браць крэдыт: у беларускіх рублях ці ў валюце? Калі ў валюце, то меншы працэнт...

— Я таксама не ўпэўнены, што лепш браць у беларускіх рублях. Справа ў тым, што ў гэтым выпадку трэба спадзявацца на вялікую інфляцыю альбо абвал рубля, і, магчыма, менавіта з-за гэтага прысутнічае невялікая паніка. Аднак у гэтым годзе я не чакаю такога абвалу рубля, бо цэны на сырую нафту ў нас застаюцца на ўзроўні мінулага года. Газ таксама пакуль даецца ў крэдыт, таму пакуль што нейкіх асаблівых знешніх прычын для хвалявання няма.

— Крэдыт пад 17—18 працэнтаў — гэта не зашмат?

— Працэнтны крэдыт у розных краінах заўсёды параўноўваецца з узроўнем інфляцыі. Калі інфляцыя ў Германіі, здаецца, 2,2 працэнта плюс маржа — 3 працэнты, то можна даваць крэдыт пад 5 працэнтаў. Калі чакаецца, скажам, 10 працэнтаў, то ў такім выпадку крэдыт даецца пад 13 працэнтаў. У нас, відаць, у апошні час дае аб сабе знаць рост цэн. Акрамя таго, ёсць яшчэ адна праблема. Многія банкі робяць так, што працэнтная стаўка ў іх здаецца заніжанай, але ў дамовах устанаўліваюцца таксы за розныя дадатковыя паслугі (абналічванне, пералік і г.д.), у выніку чаго працэнт аказваецца зноў-такі высокі. У Расіі, дарэчы, зараз прымаецца закон, згодна з якім ніякіх дадатковых грашовых пабораў, акрамя працэнтнага крэдыту, няма.

Алесь СІВЫ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Кошт жыцця банкіра — сем машын і 10 тысяч долараў

У справе забойства мінскага банкіра Аляксандра ЛІСНІЧУКА хутка будзе пастаўлена кропка.

Нагадаем, што Аляксандр Ліснічук — кіраўнік праўлення "Комінвест" і старшыня савета дырэктароў АКБ "Белбізнесбанк" — быў застрэлены снайперскай куляй 11 мая 1993 года. У Мінску, у цэнтры горада — каля магазіна "Ромашка" на былым праспекце Машэрава. Забойства адбылося, калі банкір выйшаў з офіса і садзіўся ў свой аўтамабіль. Снайпер чакаў ахвяру на будаўнічай пляцоўцы кафэ.

"Працавалі прафесіяналы", — канстатавалі затым сілавікі, якія знайшлі на месцы "лёжкі" снайпера карабін з аптычным прыцэлам.

Асноўная версія, якую на той час вылучыла следства, — забілі канкурэнты — у нейкім сэнсе сёння знайшла сваё пацвярджэнне.

Па паведамленні расійскай газеты "Коммерсантъ", днямі ў Маскоўскі гарадскі суд паступіла крымінальная справа ў адносінах да членаў "кінгісепскай" злачыннай групоўкі, якая спецыялізавалася на заказных забойствах. Судзіць будуць першапачатковы склад банды — як мяркуецца, яе кіраўніка Ірмана Ільясава і восем яго "падначаленых". Дзевяць чалавек з гэтай групоўкі ўжо асуджаны вясной. У іх багатым "паслужным спісе" фігуруе і забойства Аляксандра Ліснічука.

"Адзін з лідэраў групы, былы баксёр Сяргей Фінагін ("Фін"), пацвердзіў следству інфармацыю, што банда была створана ў 1992 годзе ў Маскве на базе ахоўнага прадпрыемства "Перевал", якое ўзначальваў жыхар Кінгісепа Ірман Ільясаў, — піша "Коммерсантъ". — Ахова ад бандыцкіх "наездаў" была патрэбна стрыечнаму брату спадара Ільясава Рыгору (Насіру) Сафіеву. Той кантраляваў цэлую групу фірм — "Пратон", "Віцязь", "Конці", "Цэзар", якія былі заняты ў розных сферах дзейнасці... Праз нейкі час група ў складзе Валянціна Лапічава, Аляксея Заздраўнага, Аляксандра Іванова, Андрэя Абрамава, Альберта Фроліна, Эдуарда Зайцава і Аляксандра Сухарава пад кіраўніцтвам Ірмана Ільясава і Сяргея Фінагіна адправілася ў Мінск, каб выканаць новы заказ — забойства кіраўніка праўлення канцэрна "Камінвест" Аляксандра Ліснічука. Як расказалі падчас следства былыя калегі банкіра, апошні восенню заключыў дамову з фірмай "Віцязь" аб прадастаўленні "Белбізнесбанкам" крэдыту ў суме 2 мільярды рублёў пад пастаўкі ў Беларусь нафтапрадуктаў. Для ажыццяўлення праекта спадар Сафіеў стварыў пасрэдніцкую фірму "Пратон", а само пагадненне было ўзгоднена з Нацыянальным банкам Беларусі. Аднак пасля пералічэння грошай фірме "Віцязь" нафтапрадукты ў краіну так і не пайшлі. Аляксандр Ліснічук быў вымушаны выехаць у Маскву, дзе сустракаўся з кіраўніцтвам "Віцязя" і выказаў свой намер скасаваць заключанае пагадненне. Аднак зрабіць гэта не паспеў. 11 мая 1993 года ў Мінску некалькімі стрэламі з карабіна банкір быў забіты. Як высветліла следства, страляў у яго Валянцін Лапічаў, а астатнія члены групоўкі забяспечвалі прыкрыццё і вялі назіранне. Па вяртанні ў Маскву кожны з членаў банды атрымаў у якасці ўзнагароды па аўтамабілі "ВАЗ", а Ірман Ільясаў і Сяргей Фінагін — па 5 тысяч долараў. Заказчыкам гэтага злачынства ў справе фігуруе Рыгор Сафіеў".

Дарэчы, сам Сафіеў пакаранні ў судзе даць ужо не зможа. У 2002 годзе ён быў забіты невядомым у ЗША...

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СКОРБЬ

Он боролся за права всех ликвидаторов

В Витебске умер один из инициаторов создания общественного объединения "Ликвидатор", инвалид-чернобылец Николай Шинковский. Ему не было и шестидесяти...

— Сердце не выдержало, — вздыхает председатель создаваемой организации Александр Волчанин. — Николай все так близко принимал к сердцу, так переживал за всех, был нетерпим к несправедливости. Закон об отмене льгот еще не был подписан Лукашенко и тем более не вступил в законную силу, а местные чиновники уже отказали Шинковскому в льготной санаторной путевке. Он так разволновался. Собирался в суд идти... А сердце больное, вот и не выдержало. Довели человека своими законами и отношением.

Николай один из первых предложил создать организацию "Ликвидатор". Два года назад умерла его жена, дети уже взрослые, он жил один, общественная жизнь занимала все его свободное время. Горел, отстаивая права других. Говорил: мы создадим организацию, которая на деле будет бороться за права ликвидаторов, инвалидов-чернобыльцев. В Беларуси де-юре подобные организации и фонды как бы есть, а де-факто... Что они делают? У ликвидаторов забрали почти все льготы, и никто слово против не сказал, никакой акции не провел. Голос подала только одна организация — "Дети Чернобыля". А где все остальные?..

19 мая Николай Шинковский присутствовал на учредительной конференции общественного объединения "Ликвидатор". Его выступление было эмоциональным и запоминающимся. Весной 1986 года он оказался в эпицентре чернобыльской трагедии. Доктор Шинковский был командиром особой военной медицинской роты заместителя министра обороны СССР. 2 мая 1986 года он прибыл в Чернобыль. В последние годы часто болел, месяцы, проведенные в чернобыльской зоне, напоминали о себе болями в сердце, изменениями в щитовидной железе, проблемами с желудком.

— Николай Шинковский был основным учредителем "Ликвидатора", — говорит Александр Волчанин. — Он так и не дождался регистрации организации, к созданию которой приложил столько сил. Мы надеемся, что до 12 июля Минюст нам даст ответ. Хотя теперь непонятно, что вообще будет с организацией. Может, ввиду смерти Николая Минюст нас и не зарегистрирует. Но ведь все учредители — ликвидаторы, некоторые перенесли операции на щитовидке, болеют. Не дай Бог с кем-то еще что-либо случится... Так нас и год можно регистрировать. А членами нашей организации захотели стать известные в Беларуси люди, много бывших военных. Мы хотим наладить диалог с чиновниками, парламентариями. Теперь в память о Николае Шинковском мы обязаны зарегистрировать общественное объединение "Ликвидатор".

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Мінск без кіёскаў?

Санэпідэмслужба прапаноўвае прыбраць з мінскіх вуліц усе камерцыйныя кіёскі. Як паведаміў БелаПАН кіраўнік Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, галоўны санітарны ўрач сталіцы Фёдар Германовіч, прычынай для гэтага паслужыў нездавальняючы стан прылеглых тэрыторый гандлёвых кіёскаў. На думку галоўнага санітарнага ўрача горада, "парадак заўсёды павінен быць як унутры кіёска, так і звонку, а яго на сённяшні дзень няма".

"Кіёскі маюць права на жыццё пры ўмове выканання ўсіх патрабаванняў. Павінны быць, па меншай меры, павільёны з каналізацыяй, як гэта належыць", — падкрэсліў Ф.Германовіч. Да таго ж, на яго думку, кіёскі *"псуюць выгляд горада"*.

Старшыня савета Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання (РГА) "Перспектыва" Анатоль Шумчанка, каментуючы прапанову кіраўніка Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, заявіў: *"Мы бачым, што ў наяўнасці спроба знішчэння дробнарознічнай гандлёвай сеткі ў горадзе Мінску. Але ж гэтая форма гандлю добра сябе зарэкамендавала: у кіёску атаварваюцца і міністры, і рабочыя. У 2003 годзе мы ўжо змагаліся за захаванне кіёскаў. Тады іх перанеслі на прыпыначныя пункты, далей ад магазінаў"*. На думку лідэра "Перспектывы", прапанова аб ліквідацыі дробнарознічнай сеткі ў Мінску з'яўляецца вынікам *"пратэкцыянісцкай палітыкі ўладаў у дачыненні да буйных гандлёвых прадпрыемстваў"*.

А.Шумчанка лічыць, што магчымае рашэнне аб закрыцці кіёскаў можа не толькі насіць эканамічны і сацыяльны характар, але і *"закране палітычную частку пытання"*. На яго думку, мінчане гэтае рашэнне не падтрымаюць. *"Рабочы ў Заводскім раёне пасля цяжкага працоўнага дня ў кіёску каля прадпрыемства можа набыць цыгарэты, ваду або піва. А куды ён пойдзе, калі ўсё гэта закрыюць, бо ў гэтых раёнах магазіны не на кожным кроку размешчаны?"* — задаўся пытаннем А.Шумчанка.

Эксперты лічаць, што ўлады ведаюць адказ на гэтае пытанне і ўсімі магчымымі спосабамі лабіруюць інтарэсы буйных гандлёвых сетак, якія ў апошнія гады ўзялі пад свой кантроль сталіцу. Менавіта ў іх інтарэсах і прымаюцца рашэнні аб спыненні дробнага гандлю. Бо ўсім зразумела: калі нейкі гаспадар кіёска развёў антысанітарыю, то менавіта яго і трэба пазбавіць ліцэнзіі. Чаму ж закрыць збіраюцца ўсіх?..

Калі ідзе размова пра неабходнасць каналізацыі, то чаму не выносіцца такое ж патрабаванне адносна кіёскаў дзяржаўнай сістэмы "Саюздрук"?..

Такім чынам, прыкрываючыся "правільнымі словамі", на самай справе лабіруюцца інтарэсы буйных гандляроў. Ці выстаіць дробны бізнес пад такім націскам?

Марына СЯЛЬЦОВА.

ЧУЛІ?

Улады ўзяліся за камп'ютэрныя сеткі

Услед за спадарожнікавымі антэнамі і кандыцыянерамі мінскія ўлады аб'явілі "паляванне" на лакальныя камп'ютэрныя сеткі, якія праведзены ў жылых дамах.

Нагадаем, што "пазбаўленне" грамадзян благаў цывілізацыі распачалося з таго, што рашэннем Мінскага выканаўчага камітэта было загадана зняць спадарожнікавыя антэны з фасадаў жылых дамоў. Абгрунтаванасць рашэння была проста "жалезнай": маўляў, неэстэтычна гэта... Хаця многія звязвалі з'яўленне такога рашэння з больш празаічнай прычынай. Як вядома, у хуткім часе з тэрыторыі Польшчы распачне вяшчанне незалежнае спадарожнікавае тэлебачанне, і для таго, каб людзі, не дай Бог, не глядзелі "няправільныя" перадачы, пажадана, каб спадарожнікавых антэн у іх наогул не было.

Адначасова па прычыне "неэстэтычнасці" з фасадаў дамоў былі паздыманы і кандыцыянеры. І вось чарга дайшла і да лакальных камп'ютэрных сетак. Супрацоўнікі ЖЭСаў сцвярджаюць, што камп'ютэрныя сеткі псуюць канструкцыю будынка і могуць прынесці небяспеку людзям. Маўляў, могуць узнікнуць пажары з-за неправільнага падключэння да электраправоду.

Для таго, каб "узаконіць" лакальную камп'ютэрную сетку, трэба звяртацца ў Міністэрства сувязі і камітэт па архітэктуры. Але на сённяшні дзень у Беларусі няма нарматыўна-прававой базы для таго, каб зарэгістраваць сетку. Таму законных лакальных камп'ютэрных сетак у жылых дамах няма і проста не можа быць. Самі ж адміністратары ўпэўненыя, што рэгістраваць сеткі будзе надзвычай складана. Да таго ж, сетка можа быць крыніцай прыбытку, які пасля рэгістрацыі пачне абкладацца падаткам.

Думаецца, што не прыбытак ад камп'ютэрных сетак хвалюе адказных чыноўнікаў і ідэолагаў. Зразумела ўсім, што карыстальнікі камп'ютэрных сетак маюць магчымасць абменьвацца любой, нават "забароненай" інфармацыяй. А гэта ў наш час — вялікая небяспека.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Охота пуще неволи

Прокуратурой Витебской области по материалам подразделений по борьбе с экономическими преступлениями УВД и Лепельского РОВД возбуждено уголовное дело в отношении директора Березинского биосферного заповедника.

Директор заповедника подозревается в том, что в период с июня по сентябрь прошлого года разрешил проведение охоты в запрещенное время. Урон, нанесенный государству в результате подобных действий, оценивается в 20,5 млн рублей, сообщает пресс-служба МВД.

Цяжкая праца беларускіх жанчын

За апошнія тры гады на тэрыторыі Масквы і Маскоўскай вобласці выяўлена каля 1200 беларускіх жанчын, якія аказвалі секс-паслугі. Пра гэта паведаміў намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі Сяргей Гурэеў.

Ён таксама адзначыў, што каля 20% зніклых беларускіх грамадзян — гэта дзяўчаты, якія працуюць у "адпаведных нелегальных падраздзяленнях".

У милиции появятся скутеры

Кроме автомобилей и велосипедов, в арсенале столичной милиции появятся скутеры. Этот вид транспорта планируется использовать во время несения службы на Цнянском водохранилище.

Как сообщил агентству "Минск—Новости" командир седьмой роты полка патрульно-постовой службы милиции ГУВД Мингорисполкома Георгий Шахрай, скутеры во многом повысят мобильность милицейских патрулей, призванных обеспечивать безопасность отдыхающих на береговой линии водохранилища и в лесном массиве.

ПРАТЭСТ

Памылка ці правакацыя?

Студэнты і выкладчыкі Гродзенскага універсітэта бароняць былую студэнтку Маргарыту Царан

20-гадовую дзяўчыну асудзілі на чатыры гады зняволення за пакупку марыхуаны вагой 0,28 грама, і зараз яна ўжо знаходзіцца ў жаночай калоніі ў Гомелі. Але за Маргарыту зараз уступіліся больш за сто студэнтаў Гродзенскага ліцэя і Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, якія накіравалі Аляксандру Лукашэнку, генеральнаму пракурору Пятру Міклашэвічу, старшыні Вярхоўнага суда Алегу Сукалу адпаведны ліст з просьбай вызваліць дзяўчыну. Падпісанты звароту лічаць, што прысуд былой студэнтцы універсітэта несправядлівы, а крымінальная справа супраць яе — вынік памылкі альбо правакацыі. Справа ў тым, што менавіта міліцыянеры папрасілі Маргарыту купіць наркотык, нібыта для раскрыцця злачынства.

На судзе былую студэнтку абараняла разам з адвакатам яе маці Валянціна. Паводле яе слоў, мэтай міліцыі было выкрыць універсітэцкага выкладчыка, які прадаваў наркотыкі, і Маргарыту проста выкарысталі: *"У нас вельмі вялікае пытанне наконт гэтага выкладчыка. Здзіўляе нахабства — чалавек прапагандуе, чалавек расказвае студэнтам-першакурснікам пра пазітыўнае ўздзеянне наркотыкаў, прадае, дае потым "праўдзівыя" паказанні следчаму — і... знікае"*.

Выкладчык права Андрэй Здасюк, сапраўды, знік, а пад суд трапіла студэнтка, якую пасадзілі на чатыры гады.

Дарэчы, гэта не першы скандал на Гродзеншчыне, які звязаны з правакацыяй, накіраванай на набыццё наркотыкаў. Як у свой час паведамляла "Народная воля", аднойчы на прыём да высокага міліцэйскага начальніка прарвалася жанчына, якая скардзілася на тое, што адзін міліцыянер угаварыў ейную дачку купіць "наркадозу" (гэты самы міліцыянер нейкі час заляцаўся да дзяўчыны), а ягоныя калегі арыштавалі яе, як кажуць, на месцы злачынства. У выніку міліцыянеры паставілі "галачку" аб раскрыцці... Высокі начальнік тады паабяцаў разабрацца ў сітуацыі. Як ён там разбіраўся, нам невядома, але правакацыі, відаць, не скончыліся.

Ігар МАРОЗАЎ.

СТАЛІЦА

Упершыню пасля рэвалюцыі ў Мінску будзе пабудаваны касцёл

Парафія св. Яна Хрысціцеля, што дзейнічае ў мінскім мікрараёне "Серабранка", па рашэнні Мінгарвыканкама атрымала дазвол на пабудову касцёла.

На выдзеленай пад будаўніцтва пляцоўцы пачалі рыць катлаван пад падмуркі касцёла, які мае стаць першым новазбудаваным касцёлам у горадзе з часу рэвалюцыі 1917 года.

Да таго, як на будпляцоўцы з'явілася цяжкая тэхніка, вакол яе была ўсталявана агароджа, перасаджаны дрэвы і зняты верхні слой глебы. На ўсталяванне агароджы было выдаткавана 18 млн 900 тыс. беларускіх рублёў, а перасадка дрэваў абышлася ў 26 млн 560 тыс. беларускіх рублёў. Кошт землярыйных работ складае 51 млн 640 тыс. бел. рублёў, і ўжо падпісана дамова на ўстаноўку свайнага поля. Паводле каштарыса, затраты на выкананне гэтай працы складуць 286 млн рублёў.

Будаўніцтва святыні адбываецца побач з капліцай, якая з'явілася ў "Серабранцы" пяць гадоў таму. Тады, як і цяпер, будаўніцтва вялося пад кіраўніцтвам і намаганнямі пробашча парафіі кс. Ігара Лашука, Серабранкаўскага дэкана. Касцёл — гэта не толькі будынак. Касцёл — гэта перш за ўсё супольнасць вернікаў, якія актыўна моляцца ў інтэнцыі будаўніцтва новай, такой доўгачаканай, святыні і, чым могуць, дапамагаюць.

Марына СУРЫК.

ЗАКУЛІССЕ

Колькі ў каго рэзідэнцый...

У прэзідэнта ЗША ёсць толькі адна загарадная рэзідэнцыя — у Кэмп-Дэвідзе. Прэмьер-міністр Англіі таксама мае толькі адну загарадную рэзідэнцыю — ў Чэкерсе... У гэтым сэнсе беларускі кіраўнік больш багаты чалавек.

Тыдзень таму ў СМІ загаварылі пра рэзідэнцыю ў Петрыкаўскім раёне. Як высветлілася, пасля хакейнага матчу з прадстаўнікамі расійскай сталіцы Аляксандр Лукашэнка аднаўляць сілы накіраваўся менавіты туды, на бераг ракі Прыпяць. Пра гэтую рэзідэнцыю вядома толькі тое, што яна ўяўляе сабой двухпавярховы асабняк з тэніснай пляцоўкай, баняй і аграмаднай прасторай для шпацыру і рыбалкі. Краявіды, кажуць, выдатныя.

Як вядома, у Аляксандра Лукашэнкі маюцца дзве рабочыя рэзідэнцыі ("Заслаўе-1" і "Заслаўе-2"), дзяржаўная рэзідэнцыя "Віскулі" ў Белавежскай пушчы, а таксама жылая рэзідэнцыя "Дразды" — інакш кажучы, дом прэзідэнта. У дапаўненне да гэтага ў канцы 1990-х былі абсталяваны і адноўлены яшчэ дзве загарадныя рэзідэнцыі. Адна на месцы былога лецішча Пятра Машэрава на беразе ляснога возера Плаўна, другая — "Азёрны", на месцы былога лецішча савецкага маршала Цімашэнкі ў Астрашыцкім гарадку. Ёсць яшчэ ўрадавая рэзідэнцыя на вуліцы Фрунзе ў Мінску. Але два апошнія адрасы, а таксама рэзідэнцыі каля Заслаўя, як правіла, выкарыстоўваюцца для прыёму высокіх замежных гасцей. Іранская дэлегацыя, напрыклад, жыла ў Заслаўі, маскоўская — у будынках на Фрунзе.

Дарэчы, свае рэзідэнцыі для гасцей і для адпачынку маюць таксама кіраўнікі ўсіх беларускіх абласцей. Прэзідэнцкія нумары таксама створаны ў беларускіх санаторыях у Туапсэ і Сочы. Але Аляксандр Лукашэнка ў іх, як правіла, не жыве, аддаючы перавагу больш дарагім атэлям.

Алег СНОЎ.

ВОКРУГ СКАНДАЛА

Дело «о подкупе игроков»

Три года назад спортивное издание "Прессбол" на основании имеющихся у него аудиозаписей рассказала, как осенью 2003 года на базу в Стайки, где к отборочным матчам чемпионата Европы готовилась команда Беларуси, приехал посредник из числа бывших футболистов национальной сборной. На беседу были приглашены несколько игроков. Суть беседы — деньги в обмен на нужный результат в матчах белорусов с чехами и молдованами.

Самые активные ставки в тот период у букмекеров были — победа чехов в Минске с разницей в два мяча и проигрыш белорусов в Молдове с разницей в один. И — о, чудо! Так и случилось.

В феврале 2005 года фактические материалы были переданы главным редактором "Прессбола" в прокуратуру, чуть позже было возбуждено уголовное дело по статье 253 ("Подкуп участников и организаторов профессиональных спортивных соревнований и зрелищных коммерческих конкурсов").

Дело "о подкупе игроков" то закрывалось, то открывалось, но затем снова тормозилось. А закончилась история тем, что, как мы уже сообщали, старший следователь по особо важным делам Александр Алейников в 38 лет был отправлен на пенсию.

Дело "о подкупе игроков" национальной сборной, возбужденное еще в 2005 году, фактически уже было расследовано. И, по словам Александра АЛЕЙНИКОВА, уже год назад его можно было передавать в суд.

"Напрямую никаких указаний не было, но в то же время давали понять: если дело будет передано прокурору для дальнейшего направления в суд, то до суда оно все равно не дойдет, — рассказывает бывший следователь. — *Намекали, что в таком случае дело будет направлено для производства дополнительного расследования по любым мало-мальским основаниям. Хотя на совещании в МВД с нами согласились, что состав преступления у гражданина Ш. (главного фигуранта дела) имеется и дело надо передавать в суд. Хотя бы для того, чтобы пресечь практику подкупа игроков. Но после этого наш отдел расформировали, меня отправили на пенсию, а дело я передал руководителю".*

Футболисту Ш., которому по статье грозило несколько лет тюрьмы, даже не избрали меру пресечения в виде заключения под стражу, и сейчас, по некоторой информации, он находится за пределами Беларуси. Не исключено, что за его плечами стоит некий высокий покровитель.

"Во время следствия появлялась информация и по другим фактам "сдачи" игр белорусскими командами из более раннего периода, — продолжает Александр Викторович. — *Но для того, чтобы не распыляться, мы изучали только те обстоятельства, которые указывались в статье "Операция "Крот" в "Прессболе". Там указываются основные подозрения в адрес двух матчей сборной (Беларусь—Чехия и Молдова—Беларусь) и матчей с участием гродненского "Немана" и солигорского "Шахтера". По поводу последних могу сказать, что, по моему мнению, это больше журналистские домыслы. Ничего серьезного, нуждающегося в дальнейшей проверке, мы не нашли. А на двух матчах с участием сборной на самом деле сыграла ставка "черного" тотализатора. Скажем так, если организационные расходы на подкуп и т.д. у организаторов этого тотализатора составили, ну, допустим, около 50 тысяч долларов, то прибыль получилась около полумиллиона "зеленых". Корни же тянутся из России".*

Итак дело "о подкупе игроков" еще не закрыто. Будет ли оно передано в суд? Это уже отдельный вопрос.

Александр НИКАНОРОВ.

МАЗАІКА

На драфце Нацыянальнай хакейнай лігі беларускія хакеісты не былі выбраны заакіянскімі клубамі.

30 клубаў лігі выбіралі маладыя хакейныя таленты, і ў папярэднім спісе скаўцкіх службаў былі два прозвішчы беларусаў: форварда мінскай "Юности" Андрэя Стася і абаронцы "Гомеля" Дзмітрыя Корабава.

За сем раундаў (211 выбараў) драфта ніводная з каманд не назвала прозвішчы беларускіх хакеістаў.

***

Беларускія атлеты заваявалі два сярэбраныя і адзін бронзавы медалі на этапе серыі Гранпры па вольнай барацьбе ў нямецкім Лейпцыгу.

***

У паўабаронцы нацыянальнай зборнай Беларусі і лонданскага "Арсенала" Аляксандра Глеба ў бліжэйшы час могуць узнікнуць складанасці з тым, каб патрапіць у асноўны склад англійскага клуба.

Брытанская каманда, пасля таго як развіталася са сваім шматгадовым лідэрам Анры, збіраецца набыць іграка французскага "Ліёна" Флорана Малуда, за якога маюць намер выкласці 17 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

Акрамя таго, "Арсенал" зацікавіўся паўабаронцам італьянскай "Ромы" Альберта Аквілані.

Алесь ЖУК.

ВНЕ ИГРЫ

Шкура неубитого медведя

*Пока даже не назначен исполком Федерации футбола Беларуси, где будет рассмотрен вопрос об отставке либо неотставке главного тренера национальной сборной Юрия Пунтуса, а в околофутбольных кулуарах уже начали делить якобы освободившееся кресло. Называются и два претендента на этот пост — **Анатолий БАЙДАЧНЫЙ** и **Михаил ВЕРГЕЕНКО**.*

На наш взгляд, обе кандидатуры крайне неудачны, поэтому можно только догадываться, откуда пошли слухи.

Михаил Вергеенко уже дважды входил в одну и ту же реку — возглавляя сборную в 1992—1993 и 1997—1999 годах. "Второе пришествие Михаила Вергеенко", — возвещали в то время заголовки газет о повторном назначении Михаила Никифоровича, но звезд с неба ни он, ни команда под его руководством не нахватали ни в первый раз, ни во времена "второго пришествия". Вот скандалы в сборной — это было, хотя для белорусских футболистов-сборников это уже становится менталитетом.

Согласен и — главное — способен ли вице-председатель Белорусской федерации футбола оставить место футбольного функционера и заняться творческим процессом — очень большой вопрос.

Впрочем, персона **Анатолия Байдачного** еще более противоречивая. Ведь именно его в 2005 году сменил **Юрий Пунтус.** Говорят, что Анатолий Николаевич тогда сильно обиделся. Команда играла с перепадами, но отдельными играми сборная радовала и душу, и глаз. Время немного сгладило обиды. Уже вскорости Анатолий Байдачный был замечен на играх сборной в VIP-ложе рядом с председателем БФФ **Геннадием Невыгласом,** что, не исключаем, и дает повод некоторым считать кандидатуру Байдачного одной из возможных на пост главного тренера.

Если бы не недавний скандал с "Даридой", когда глава ждановичского клуба Владимир Делендик отправил Анатолия Николаевича в отставку.

Напомним, что еще накануне футбольного сезона Анатолий Байдачный заявил о том, что он отказался от четырехлетнего контракта с китайским клубом "Тяньцзинь" на сумму в полтора миллиона долларов и подписывает соглашение о работе с "Даридой". Но не успел белорусский чемпионат дойти и до экватора, как **Владимир Делендик** дал наставнику своего клуба отставную, при этом публично заявив: *"Основная причина оставки — полный развал команды. Перед тем как отправить тренера в отставку, я собрал игроков и выслушал, что они о нем думают. И во время нашей беседы понял, почему практически самая высокооплачиваемая команда в Беларуси занимает 12-е место среди 14 клубов. Есть ряд игроков, которые получают пять тысяч долларов. И сам главный тренер получал больше, чем в сборной Беларуси... В команде нездоровый микроклимат. Во время матча в Витебске Анатолий Байдачный оскорблял не только футболистов, но и врачей, и массажистов. Оскорблял такими словами, что найти даже трудно. Ребята мне говорили: "Владимир Викторович, мы же с вами контракт подписали, а не с Байдачным".*

Анатолий Николаевич сейчас на самом деле без работы, Михаил Никифорович продолжает трудиться в БФФ, Юрия Иосифовича Пунтуса тоже пока никто не увольнял, хотя сам он на днях написал заявление об отставке. Ясно одно — чем ближе исполком, тем сильнее будут подогреваться слухи.

Алесь СИВЫЙ.

РАКІРОЎКА

Юрый Пунтус вяртаецца «на кругі свая»

Напрыканцы мінулага тыдня галоўны трэнер зборнай Беларусі Юрый Пунтус вырашыў сам напісаць заяву аб сваёй адстаўцы. У мінулы панядзелак ён ізноў узначаліў сталічны клуб МТЗ-РІПО.

Нагадаем, што пасля двух пройгрышных матчаў зборнай Беларусі з камандай Балгарыі шмат хто загаварыў аб хуткай адстаўцы Юрыя Пунтуса. Аднак кіраўнік Асацыяцыі "Беларуская федэрацыя футбола" Генадзь Нявыглас пагутарыў пасля гульняў з трэнерам і адстаўку не прыняў.

Усё павінна было вырашацца на выканкаме Федэрацыі ў пачатку ліпеня, аднак Юрый Іосіфавіч вырашыў не чакаць "з мора надвор'я". І сам напісаў заяву аб звальненні.

Тым больш што ў МТЗ-РІПО, дзе Юрый Пунтус працаваў з лістапада 2004-га па лістапад 2006-га, яго ўжо чакалі.

Як паведамляе прэс-служба "трактарыстаў", былому настаўніку клуба Андрэю Зыгмантовічу будзе прапанавана аналагічная пасада ў літоўскім "Каўнасе".

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СЛЫШАЛИ?

За олимпийскую медаль будут давать квартиру в Минске

Белорусские спортсмены — призеры Олимпиады-2008 в Пекине получат в подарок квартиры в Минске. Об этом на пресс-конференции в белорусской столице по поводу Международного олимпийского дня сообщил первый вице-президент Национального олимпийского комитета Беларуси Геннадий Алексеенко.

По его словам, НОК заключил договор с одним из своих партнеров. Согласно условиям соглашения, спонсор предоставит 20 квартир в столице для призеров Игр-2008.

На вопрос о том, как поступать в том случае, если Олимпийскую награду завоюет экипаж-восьмерка в академической гребле, Геннадий Алексеенко ответил: "Одно призовое место — одна квартира". То есть одну квартиру придется делить на 9 человек, ведь, кроме восьми гребцов, в лодке находится еще и рулевой.

Помимо квартир, белорусские олимпийские призеры получат призовые деньги. Указом Александра Лукашенко суммы вознаграждений увеличены. Чемпионы 2008-го и 2010 годов получат по 100 тысяч долларов США, серебряные призеры — по 50 тысяч, бронзовые — по 30 тысяч.

На вопрос о медальном плане на пекинскую Олимпиаду первый вице-президент НОК ответил, что жесткой нормы нет. Есть пожелание выступить не хуже, чем на предыдущих Играх в 2004-го в Афинах, когда было завоевано 15 наград. По мнению Геннадия Алексеенко, потенциал белорусских спортсменов позволяет рассчитывать на такой показатель.

Игорь МОРОЗОВ.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

"Готовы ли вы возглавить национальную сборную?" — обратился, следуя за народной молвой, корреспондент "Народной воли" к двум новым "назначенцам".

Анатолий БАЙДАЧНЫЙ:

— Сегодня возглавить сборную я пока не готов. А вообще, когда что-то будет, тогда можно и поговорить. Чего раньше времени делить шкуру неубитого медведя?

— Чем вы сейчас занимаетесь?

— Чем можно заниматься после отставки? Отдыхаю, телевизор смотрю.

— Анатолий Николаевич, а как Вы восприняли высказывания Владимира Делендика в свой адрес?

— Наговорить можно все что угодно. Я когда-нибудь тоже соберусь с духом и тогда уже та-ако-ое (!) про него вспомню... Говорят вот, что футболисты против меня выступили. Как могли против меня выступить футболисты, которых я сам пригласил в команду?! А насчет зарплаты... Это же не я себе назначал зарплату, это же Делендик мне ее предлагал. И он же за это обиделся.

Михаил ВЕРГЕЕНКО:

— Насчет моего возможного назначения главным тренером национальной сборной — полнейший бред! И добавить к этому абсолютно нечего.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

У Вас — усяго 2 дні!

...Каб не застацца без «Народнай волі»

Так, да 1 ліпеня — 2 дні. Таму, шаноўныя сябры, не спазніцеся зрабіць **перадаплату** за **другое паўгоддзе**.

Паўтараем: не маеце магчымасці заплаціць за нумары ўсіх шасці месяцаў — зрабіце **перадаплату** за любы тэрмін: за месяц, два, тры...

Агітуйце за "Народную волю" блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна да канца года), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апаратыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Трагедыяй скончыўся першы этап чэмпіянату Беларусі па картынгу

Як паведамляе ўпраўленне ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, пасля правядзення мерапрыемства яго ўдзельнікі — трэнеры, маладыя спартсмены і іх бацькі — адправіліся на тэрыторыю картадрома Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў па вуліцы Макаёнка ў Мінску. *"Для дзяцей арганізавалі манеўраванне па картадроме, а дарослыя адзначалі, ужываючы спіртное",* — гаворыцца ў паведамленні ДАІ. Паводле інфармацыі супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, "пасля ўжывання шклянкі гарэлкі" адзін з выкладчыкаў на асабістым аўтамабілі "Фальксваген-Транспарцёр" вырашыў паказаць клас, але на апошнім павароце перад фінішам не справіўся з кіраваннем і ўчыніў наезд на свайго выхаванца, 13-гадовага сына свайго сябра. Машына наехала левым пярэднім колам на спіну хлопчыка.

У выніку падлетак у цяжкім стане быў дастаўлены ў рэанімацыю з ударам лёгкіх, закрытай траўмай жывата і крывазгарканнем.

Аляксей АРЭШКА.

Чалавек-гара змяніў трэнера

Новым трэнерам расійскага баксёра-цяжкавагавіка Мікалая Валуева стаў Аляксандр Зімін, які раней узначальваў аматарскую зборную СССР.

У 1990 годзе Зімін з'ехаў у Японію, дзе працаваў са сваімі выхаванцамі Юрыем Арбачакавым і Арзубекам Назаравым. Абодва баксёры затым сталі чэмпіёнамі свету, а Арбачакаву ўдалося абараніць свой тытул дзесяць разоў запар.

Рашэнне аб змене трэнера было прынята штабам Валуева пасля паражэння ад узбека Руслана Чагаева ў красавіку гэтага года, калі расіянін страціў тытул чэмпіёна свету па версіі WBA.

Наступны свой бой Мікалай Валуеў правядзе 30 верасня 2007 года супраць канадца Жана-Франсуа Бержэрона.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 27.06.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №